Ба 4836

Б 8/~~9541~~

П. ГОЛУБЕЎ



# ЗАВІРУХА

Б. ДЗ. В. 1930


…аўная бібліятэка імені Леніна БССР

Ба 4836

П. ГОЛУБЕЎ

# ЗАВІРУХА

*АПОВЕСЬЦЬ З ЖЫЦЬЦЯ ДЗІЦЯЧАГА ДОМУ*

Пераклад з расійскае мовы
З. Астапенкі

Б-9541
Інв. 1953 г.
Бел. аддзел 1994 г.
БЖ 4836

БЕЛАРУСКАЕ ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА
МЕНСК—1930

Вокладка мастака
Эйдельмана

25.04.2009

Заказ № 1125. 5.000 экз. (5½ арк.) Галоўлітбел № 2697

Друкарня БДВ імя Сталіна.

I

## ЖЫЦЬЦЁ-БЫЦЬЦЁ

Трыццацёхградусны сібірскі мароз трашчаў, запаўзаў у шчыліны, у пабітныя шыбы. Белымі лапамі чапляўся па кутох.

У прытулку холадна. Міхалку Козыру не хацелася самамуісьці па валёнкі па халоднай падлозе. Ёё зірнуў з-пад коўдры: каго-б пасланць?

Хлопцы прачнуліся, але ад холаду сьціскаліся ў камячок, закрываліся з галавою коўдраю.

— Паўлюк, прынясі валёнкі!—крыкнуў Міхалка.

— Сам пойдзеш—не вялікі пан!—агрызнуўся той з суседняга ложка.

— Га-а, не вялікі?—і ў той-жа момант Паўлюк дастаў па патыліцы.—Ня пойдзеш?

— Ды добра, навошта б'ешся,—зарумзаў Паўлюк і пайшоў на кухню.

— На!—кінуў ён, прышоўшы, у Міхалку валёнкамі.

— Пакідайся... Мала табе? Яшчэ дастанеш!—страшыў той.

— Ой, генэрал які знайшоўся!—пачуўся з кута кплівы голас Гошкі Касога.—Паўлюк, яго дастойнасьці порткі апрані!

Хлопцы былі зарагаталі, але стрымаліся, бо баяліся, каб ад Міхалкі і ім не дасталося.

Міхалка быў самым старэйшым, і хто йшоў супроць яго, таму пападала.

— Паўлюк, пашоў боты пачысьці!—Ня сьціхаў Гошка.

— Ты, крывы, глядзі... Я табе ўсю зайцавую морду разаб'ю—раззлаваўся Міхалка.

— Бач, які знайшоўся... Фу ты, ну ты, ваша дастойнасьць! А гэта бачыў?..—і Гошка, крывячыся на ложку, паказаў Міхалку носа.

Гошка адзін з усіх хлапцоў не паддаваўся Міхалку, хоць ён і быў меншым і слабейшым за Міхалку.

— Я і пэцкацца аб цябе ня буду,—падумаеш, сьмелы які!.. Толькі варта Кацярыне Астахаўне сказаць, не дастанеш абеду,—паддаваўся Міхалка.

— За тое ты падвойную порцыю атрымаеш. Жары, падлізьнік!

— Падлізьнік? Дык я падлізьнік?—і Міхалка кінуўся на Гошку.

Гошка ў аднэй кашулі і споднім, як заяц, скакаў па ложках наступаючы хлопцам на ногі.

— Гошка, чорт! Ня бачыш зкосу!—лаяліся абураныя хлапцы. А самі радаваліся, што Гошка не паддаецца Міхалку.

— Пачакай, крывы, я табе ўспомню, дастанеш калі-небудзь!

— А вось не пападуся... Вось табе, зьеш!—і Гошка паказаў хвігу.

Міхалка па ложках кінуўся за Гошкаю, а той, бразнуўшы дзьвярыма, босы выскачыў, на двор і ўцёк у Тайданаву хатку.

— Гэта чорт ведае што!—закрычаў, убегшы ў спальню ў аднэй бялізьне майстар Шандор з лазінаю ў руках.—Начальніцы скажу... Міхалка вялікі... Брыда... раскудлачаны майстар здаўся хлопцам сьмешным,—зарагаталі, нехта мяўкнуў, нехта сьвіснуў.

У Шандора пабялелі губы, вочы зрабіліся злоснымі, і ён пачаў хвастаць дубцом па коўдрах. Хлопцы каручыліся пад коўдрамі ня столькі ад болю, колькі дзеля свавольства і ад холаду. Нехта крыкнуў:

— Начальнічка ідзе!—і Шандор схаваўся ў свой пакой.

Начальнічка, як зваў майстар загадчыцу, Кацярыну Астахаўну, сівая зморшчаная, як сушаны грыб, старая, бомбаю ўляцела ў спачывальню.

— Як вам ня сорамна! Спаць не даеце. Сваволіце, як бальшавікі якія. Ты, Козыр, большы—іншых сунімаў-бы, а ты сам

заводзіш...—прычапілася яна да Міхалкі.—Што на вас старэйшага ці што няма?

Майстар ізноў выскачыў, ужо апрануты.

— Гэта няма ведама што! Гвалт... пацаны... Міхалка, Гошка...—махаў ён рукамі і нешта мармытаў па-свойму, па-вэнгерску, бо расійскіх слоў ён ведаў дужа мала.

На гармідар прыбегла Стэпа, кухарка ў прытулку, з дайніцаю ў руках.

— Ці ня мой злодзей, Рыгор, тут свавольнічае? Дай ты яму добра, матухна Кацярына Астахаўна.

— Ня мыркай!.. Ня бачыла, а прэшся... «Дай»...—па-грубіянску агрызнуўся на матку Рыгор.

— Рыгор, грубіян!—абурылася загадчыка.—Зьбіць цябе мала за гэткае грубіянства.

— А чаму яна чапляецца?—апраўдваўся Рыгор.

— Устаць зараз-жа!—загадала Кацярына Астахаўна.—Шандор, пасадзеце іх за працу без гарбаты... Свавольнікі!

Як пайшла начальнічка, майстар, пакрыкваючы, падганяў хлапцоў:

— У Вэнгрыі так няма... Хлопец у Вэнгрыі добра... Русіш ня добра...

Хуценька памыўшыся, хлопцы перайшлі ў майстэрню, поруч са спачывальняю.

Майстар, разлаваны хлапцамі, быў пахмурны. Моўчкі разарваў няскончаныя ўчора вялікія кошыкі пад бялізну.

Хлопцы пацішэлі, толькі хрумст прутоў ды паварочваньне кошыкаў парушала цішыню.

Міхалка Козыр, зьняважаны перад хлопцамі вымоваю загадчыцы, майчаў, нібы нешта задумваў.

Гошка пасьля ўсіх зьявіўся ў майстэрню і, нібы нічога й сталася, ня гледзячы на Міхалку сеў на сваё месца.

Рукі ва ўсіх нылі ад працы; заказ кошыкаў быў тэрміновы. «Апякуновы камітэт гораду», які ўтрымліваў на свае сродкі прытулак, двойчы прыпамінаў загадчыцы, каб заказ у тэрмін выканаць абавязкова.

Міколка выпроставаў пальцы: яму не хацелася сёньня брацца за вялікі кошык.

— Міколка,—злосна сказаў майстар,—дай кошык!

Майстар яшчэ здалёк заўважыў, што кошык крывы.

— Дрэнны кошык!

— Ня ўмею лепш,—апраўдваўся Міколка.

— Нэ ўмэй! А есьці ўмэй? Нэ кочу!—і вылаяўся па-свойму.—Трэба добра форма кошык!—ткнуў майстар Міколку кошык у твар.

Міколка пачырванеў.

— Ня бiся!—і ад крыўды, нібы нехта схапіў яго за горла, на вачох паказаліся сьлёзы, і сьціснуліся кулакі.—Сам рабі!

Майстар не зразумеў, але, адчуўшы дзёрзкасьць, вылаяўся і, выхапіўшы з пука лазіну, ударыў Міколку па голых нагах.

Міколка войкнуў, схапіўшыся за нагу і загаласіў; потым раптам кінуўся з месца і сваім кошыкам шпурнуў у майстра.

— Вось табе, калі гэтак!—закрычаў ён злосна і кінуўся бегчы з майстэрні.

Шандор пабег за Міколкаю, але, не дагнаўшы, вярнуўся яшчэ больш злым: крычаў, лаяўся, махаў прутам, прагнаў Сымонку, які трапіў пад ногі.

— Горад трэба... Камітэт заявіць... нэ добры русіш...—Потым загадаў хлопцам сёньня скончыць кошыкі, а сам пайшоў з майстэрні.

Зараз-жа Сымонка прыбег назад, прайшоў у спальню, выцягнуў з-пад пасьцелі два паліто і дзьве шапкі, забраў Міколкавы валёнкі і пабег у Тайданаву хатку. Там, на печцы, за камінам, сядзеў Міколка і плакаў.

— Міколка, зьлязай хутчэй, апраніся да гайда на вуліцу.

Міколка хутка саскочыў з печкі, апрануўся.

— Назаўжды ўцяку... Д'яблы з імі... Даўно зьбіраўся, ды неяк страшна было, а цяпер ўцяку,—рашуча сказаў Міколка.

— І я з табою, Міколка. Добра?

— Гайда! Падпяражыся вось вяроўкаю—цяплей.

Апрануліся, толькі-б ісьці, а ў дзьверы Тайдан, шавец у прытулку, сівенькі дзядок.

— Куды?

— Кацярына Астахаўна па малако пасылае,—схлусіў Міколка.

— Га-а, добра... Ну, смалеце, гарбату з малаком будзем піць... Бярэце вось рукавіцы, усё-ж цяплей,—і Тайдан даў Міколцы свае рукавіцы.

Міколцы зрабілася няёмка, што ён схлусіў Тайдану, і ён не хацеў браць рукавіцы.

— Вось табе! Што за размовы? Бяры... бяры... Сёньня мароз люты.

Выйшлі з хаткі, забеглі на задні двор. Міколка выцягнуў кошык, што ён схаваў, яны пераскочылі праз плот і драпанулі ў завулак.

— Хлеба ня ўзялі!—успомніў Сымонка.—Увесь час думаў, што трэба, а як выбеглі, дык і забыўся.

— Няма бяды, за кошык купім сказаў Міколка і зайшоў у крайнюю хатку.

— Бачыш, вось і хлеб ёсьць,—паказаў Міколка акраец хлеба і схаваў яго за пазуху.

Хутка выйшлі за вёску ў поле. Спыніліся, адшукалі вачыма дах прытулку.

Міколку ўспомнілася сьмярдзючая цесная спальня, Міхалка Козыр, брудная майстэрня з сярдзітым майстрам, сухая, старая загадчыца, якая ніколі не сьмяялася, заўжды бурчэла, навучала, карала...

— Тфу!—плюнуў Міколка.—Тайдана толькі шкода, а так-бы спаліў—хай усё гарыць!.. Пабяжым, Сымонка, бо яшчэ можа наўздагон накіруюцца.

І два нявольнікі, што вырваліся на волю, трухом пабеглі да лесу.

## II

## НА ВОЛІ

У белым сасновым бары было ціха. Толькі часам патрэсквалі сухія галінкі пад цяжарам сьнегу, што асыпаўся з верхавін.

— Стой, Сымонка!

Спынілася, адсапліся... У лесе нікога.

— Чуеш, Сымонка,—ні старое, ні Шандора, ні Козыра, ні праклятых кошыкаў. Разумееш, адны мы! Добра... Ура!—крыкнуў Міколка і недзе звонка-звонка адгукнулася: а, а!

— Нехта крычыць,—спалохаўся Сымонка.

— Ніхто... гэта мой голас аддаецца. Слухай, я крыкну: бывай!

А ў лесе, нібы нехта, уцякаючы, крычаў: ай, ай!

— Мы ўцяклі зусім!..

А ў лесе адчувалася—ім, ім, ім!..

— Ня вернемся ніколі!

А вясёлае рэха сьцьвярджала: олі, олі!

— Ну, Міколка, бяжым, у мяне ногі мерзнуць,—падганяў Сымонка.—Хутка будзе вёска?

— Вёска яшчэ ня хутка. Падбяжым!

Прабеглі кілёмэтраў з пяць. Лес парадзеў, дарога павузела.

— Што-ж гэта за дарога?—разважаў Міколка, здаецца часовая, па дровы езьдзяць.

Дарога павярнула ў глыб лесу, хлопцы пайшлі сьледам. Улезьлі па калені ў сьнег, сьнег правальваўся пад нагамі, насыпаўся ў валёнкі.

— Міколка, мы заблудзілі... Ці не вярнуцца назад? Зьмерзьнем!

— Зьмерзну, ды не зьвярнуся!—станоўча сказаў Міколка і пайшоў наперад.

Зрабілася пад нагамі цьвярдзей, вузенькая сьцежка; павытрасалі з валёнак сьнег і пайшлі далей. Міколка бадзёра крочыў першым, а Сымонка, сьціснуўшыся ад холаду, ледзь пасьпяваў за ім і ўжо гатовы быў расплакацца.

— Хутка выйдзем з лесу,—падбадзёрваў яго Міколка—вось і поле відна.

— Выйшлі на ўзьлесьсе, да закінутае хаткі.

— Вось яно куды выйшлі!—зьдзівіўся Міколка. Тут раней Манастырскі пчальнік быў. Зайдзем у хатку!

— А калі там бандыты ці бадзягі якія?—спалохаўся Сымонка.

— Ну, якія там бандыты! Пэўна нікога няма.

З коміну пайшоў дым.

— Міколка! дым!—спалохана сказаў Сымонка і падсунуўся бліжэй да Міколкі.

— Так, нехта ёсьць,—адказаў Міколка і нерашуча спыніўся.—Пачакай тут, я зірну ў акно, хто там,—сказаў Міколка і шпарка пайшоў да хаткі.

Асьцярожна прайшоўшы каля сьценкі, Міколка доўга ўзіраўся ў шчыліну вакна, забітага з нутра дошкамі.

— Сюды!—махаў ён рукою да Сымонкі.—Хутчэй!

Сымонка, ледзь перасоўваючы адубянелыя ногі, таксама асьцярожна прайшоў паўз сьценкі.

— Глядзі, хто!—сказаў Міколка, падсаджваючы Сымонку.

Сымонка спачатку ня мог разгледзець, потым, прыгледзеўшыся, убачыў чорнага чалавека, які сядзеў на карачках перад жалезнаю печкаю.

— Валацуга, як піць даць... альбо злодзей які...—спалоханым голасам сказаў Сымонка.—Далейісьці не магу,—зьмёрз!— і сьлёзы самі пакаціліся па Сымонкавых шчоках.

— Гайда ў хату!—даў каманду Міколка яшчэ лепш, што там чалавек ёсьць,—адагрэемся!

## III

## ЧОРНЫ ЧАЛАВЕК

Міколка смаргануў за клямку,—дзьверы на засаўцы.

— Хто?—пачулася з-за дзьвярэй.

— Дзядзечка, пусьці пагрэцца!—папрасіўся Міколка.

Дзьверы адчыніліся.

— Заходзьце. У мяне якраз печка паліцца, цёпла!

У Сымонкі душа ў пяткі ўскочыла: зачыніць дзьверы і канцы!—ня выпусьціць.

Міколка сьмела ступіў праз парог і перацягнуў Сымонку.

— Разувайся, сядай да печкі, грэй ногі!—запрашаў чорны.

Міколку сьцягнуў з Сымонкі валёнкі.

— Эх, брат, памарозіўся!—сказаў гаспадар, абмацваючы Сымонкавы ногі.

Сымонка сваіх ног ня чуў, сядзеў бяспомачна на падлозе і дзьмуў на замерзлыя рукі.

Чорны прынёс сьнегу і пачаў адціраць Сымонкавы ногі.

— Ой, шчыпае! Баліць!—усхліпваў Сымонка.

— А гэта добра, што шчыпае. Патрывай яшчэ крыху, ногі твае аджывяцца.

Ногі хутка зрабіліся зусім чырвонымі.

— Ну вось і гатова!—сказаў чорны ўстаючы з падлогі.

Сымонкавы ногі гарэлі, калола ў пальцы, і па ўсім целе разьлівалася цяплыня.

Страх зьнік. Сымонку было прыемна глядзець на пачырванелага чорнага чалавека.

— А зараз гарбаты пап'ем,—весела сказаў чорны, ставячы на печку бляшаны чайнік са сьнегам.—Хутка адагрэецеся! А чаму гэта вы па лесе гуляеце ў гэткі мароз,—ці заблудзілі?

Міколка ня ведаў, хітраваць ці расказаць усю праўду.

— З дарогі зьбіліся,—нявыразна адказаў ён.

— Адкуль вы?

— З чырвонага Яру, у колёнію пайшлі,—нечакана для сябе схлусіў Міколка.

— Навошта?

— Так, пайшлі і ўсё.

— Блытаеце вы нешта, хлопцы... прызнавайся, нічога ня будзе. Я судзьдзя строгі, але літасьцівы.

Чорны, сьмяючыся, пільным вокам сачыў за ўцекачамі. Міколка з Сымонкаю зусім замяшаліся.

— Можа вы дэзэртыры, перабежнікі?—жартаўліва дапытваўся чорны.—Можа бальшавікі?

— У нас вілак няма,—набраўшыся сьмеласьці, адказаў Сымонка.

— Якіх вілак?—зьдзівіўся чорны.

— А якімі хлопцаў і баб бальшавікі колюць.

— Дзе гэта ты чуў?

— Нам вясковы стары Кундзюкоў учора казаў, сам, кажа, у горадзе бачыў, вось гэткія малюнкі налеплены на платох. Твары, кажа, страшэнныя, а ў руках вілкі ў тры рагі, а на іх хлопцы, як бульба, насаджаны.

— Брэша ваш Кундзюкоў, проста палохае, а вы і верыце. Зроду ня чуў, каб дзе такія людзі былі. А вы, як думаеце, могуць быць такія людзі?

— Ня ведаем,—адказалі хлапцы.

Закіпеў чайнік, пачаў паплёўваць на гарачую печ з наска.

— Ну, вось, і гарбата гатова, піце!—запрашаў іх чорны, ставячы на стол кубак і бляшанку.

Гарачая гарбата зусім прагнала ўсякі страх. Міколка і Сымонка ламалі замерзлы хлеб, запіваючы гарачаю гарбатай.

— А ты, дзядечка, адкуль?—запытаў Міколка.

— Вы ведаеце мяне, навошта пытацца?—сказаў чорны.

Міколка з Сымонкаю зірнулі адзін на аднаго—зроду ня бачылі.

— Не, ня ведаем.

— Ну, як ня ведаеце! Каб ня ведалі, не казалі-б, хто я такі.

У хлопцаў уся сьмеласьць зьнікла.

— Нічога не казалі,—нясьмела адказаў Міколка.

— Ну, не казалі, дык падумалі,—ня ўсё роўна?

Хлопцы не разумелі, да чаго ён гаворыць.

— Ой, хлопцы, хітруеце! Ня люблю, калі пацаны хлусяць! Казалі-ж, што я валацуга ці бандыт,—правільна?

У Сымонкі на вачох паказаліся сьлёзы—гэта ён назваў яго валацугаю. Як ён даведаўся. Ён-жа толькі аднаму Міколку сказаў ды і то зусім ціха.

— Я болей ня буду!—зарумзаў Сымонка,—я думаў...

— Ха-ха-ха!—засьмяяўся чорны.—Ды чаго ты плачаш?— Эх, ты, румза! Ну й дзівак!.. Як цябе завуць?

— Сымонка, а яго—Міколка.

— Што-ж ты, брат Сымонка, спалохаўся, га? Ну, падумаў,— валацуга, вялікае гора! Усякі-б так падумаў, бо—лес, закінутая хатка, і раптам чалавек нейкі... Хто-ж як не валацуга? Блукае чалавек з месца на месца, вось і валацуга, нічога асаблівага.

Міколка з Сымонкаю ня ведалі, што і падумаць—жартуе ён ці праўду кажа. Бач, думкі іхныя адгадаў! Гэта прымусіла хлапцоў задумацца: усё роўна ад яго нічога не схаваеш, даведаецца; лепш расказаць яму ўсё, як ёсьць.

А чорны гаварыў далей:

— Можа, іншаму чалавеку і нельга на адным месцы жыць: можа яго якія-небудзь зладзеі шукаюць, каб зьнішчыць,—ну вось ён і блукае з вёскі ў вёску, з гораду ў горад, у лес ці яшчэ куды-небудзь, хаваецца да добрае гадзіны, а прыдзе час—і зьявіцца.

У хлапцоў адлягло ад сэрца—не пакрыўдзіўся!

— Мы—з прытулку!—рашыў прызнацца Міколка.—Схлусілі табе... Уцяклі адтуль...

— Як уцяклі? Чаму? Куды?—зьдзівіўся чорны.

— Так, назаўсёды ўцяклі... ня вернемся ніколі.

— Ды чаму? У такі холад!

— Абрыдзела, ды Шандор б'ецца.

— Хто гэта Шандор?

— Майстар наш, вэнгэрац,—палонны ён, з германскае вайны яшчэ... тры гады ў нас жыве, замучыў на копыках. Па-расійску кепска гаворыць, хлопцы не разумеюць, а ён думае, што ня слухаюцца—ну, дубцом лупцуе... Міхалка Козыр задаецца: думае, што большы за ўсіх, дык і можна крыўдзіць. Менш за ўсіх працуе, усё на маленькіх выяжджае, а хто ня слухаецца—б'е!

Усе свае крыўды выклалі хлопцы перад чорным, а той ужо не сьмяяўся, а ўважліва слухаў і пра нешта думаў.

— Ну, вось што,—сказаў ён:—уцякаць вам ня варта; яшчэ дзе-небудзь зьмерзьнеце, альбо з голаду зваліцеся. Зараз вяртайцеся ізноў, ціхутка пажывеце да лета. Улетку цёпла, суха, добра. Ідзі куды хочаш,—дарогі табе на ўсе чатыры бакі адчынены. А да тае пары, як кепска вам будзе, прыходзьце сюды, разам што-небудзь і прыдумаем. А ўлетку... можа і я разам з вамі пасунуся,—утрох весялей. Катанём куды-небудзь у добрыя краі! Ды ўсім не кажэце, што я жыву тут, бо манахі—народ скупы—зараз-жа выганяць, а плаціць мне няма чым—ні капейкі няма. Так ці не?

І чорны весела ўсьміхнуўся.

Міколка падумаў, падумаў,—яму ўжо дужа не хацеласяісьці назад у прытулак; але-ж ізноў улетку... і ўтрох лаўчэй...

— Добра! да лета як-небудзь пражывем,—адказаў Міколка.—Пойдзем, Сымонка! Дзякуй, дзядзечка, што адагрэлі!

— Дзякуй,—сказаў Сымонка, і разьвіталіся за руку...

— Няма за што! Што там! Бывайце!

Хлопцы выйшлі з хаткі і тою-ж дарогаю пайшлі назад.

## IV

## У ТАЙДАНА

Міколка з Сымонкам прайшлі проста ў хатку да Тайдана—так менш было небясьпекі.

— Ах, вы круцялі, уцекачы няшчасныя!—крыху жартам, крыху сур'ёзна лаяў Тайдан.—Мы тут усю міліцыю на ногі паставілі, тэлеграму ў горад далі. Вось, вось глядзі, апякун з горада прыедзе! А Шандор па сьвежую лазіну пайшоў, тысячы з паўтары, пэўна, прыцягне. Я ўжо і кацёл нагрэў, каб дубцы распарыць: распаранымі хвасьціць лаўчэй. Будзеце хлусіць!

— Палохаеш, Тайданачка!—сказаў Сымонка: добра бачыў па вачох, што Тайдан жартуе.

— Ну, добра. Кажэце, дзе былі?—ужо зусім вясёла запытаў Тайдан.

— Нідзе ня былі,—у лес хадзілі. Намерзьліся і назад прышлі,—сказаў Міколка і зірнуў на Сымонку, каб той не сказаў лішняе.

А Сымонку дужа хацелася сказаць Тайдану пра чорнага чалавека.

Выбраўшы час, калі Міколка залез на печку і заснуў, Сымонка запытаў:

— Тайдан, якія гэта людзі блукаюць з месца на месца, хаваюцца да часу, а потым зьяўляюцца.

— Хм, якія? Зброднікі, вось якія... ці зладзеі... Сьвіснуць дзе-небудзь,—ну і хаваюцца...

— А не зладзеі бываюць?

— Не зладзеі?—Бываюць і не зладзеі. У нас быў такі выпадак, даўно гэта было. Станавы прыслаў падаткі выкалачваць з нашай вёскі: ну, у ўдавы Савецеі і апошнюю карову зводзяць з двара; тая—у сьлёзы, галосіць на ўсю вуліцу. А ў нас матрос з параходу зімаваў, здаровы такі хлапец,—на станавога: ня

маеш, кажа, права апошнюю жывёлу забіраць, няма такога закону!» Станавы ўзьеўся: «З кім размаўляеш, такі ды такі!»— ды ў вуха. А матрос—дзе-ж стрываць!—станавога! Той за шаблю, матрос шаблю вырваў, станавога за каршэнь ды й пусьціў з абрыву, той і ляцеў па сьнезе. Ураднік ды соцкі аслупянелі, стаяць ня рухаюцца. А матрос за хаты, і ўцёк. На другі дзень прыгналі салдат, ураднікаў, акружылі матросаву хату. А ён, яго шчасьце, у лес пайшоў, дубцы на кошыкі рэзаць; ну, бачым, што хлопец бяз віны прападзе, за праўду стаяў. Трэба папярэдзіць. Я і пайшоў—на лыжы, ды за рэчку: хлеба акраец з сабою ўзяў на ўсякі выпадак. А ён з лесу з дубцамі—нібы нічога і ня было. «Ну, кажу, Пятро, гора табе»,—і расказаў яму ўсё. Аддаў лыжы, хлеб, капшук свой з тытуном: бяжы, кажу, на Кандзюкоўскую пашню, там цябе ніякая сабака ня знойдзе, а я, кажу, да цябе потым завітаю. Так і хавалі яго да самых паводак, а там ён—на свой параход—і шукай ветра ў полі.

— Ён так усю зіму ў зямлянцы і жыў?—запытаў Сымонка.

— Якое ўсю зіму, на яго сьлед напалі—тады, а ён на шчасьце на іншае месца пайшоў, так усю зіму і цягаўся.

— А табе нічога ня было?

— Як ня было! Нейкі гад мяне здрадзіў, у валасьць цягалі, колькі ў горадзе ў вастрозе сядзеў. «Ні сном, кажу, ні духам ня ведаю, куды падзеўся».

Ну, патрымалі, патрымалі, бачуць, што ад мяне нічога не дастукаешся,—выпусьцілі.

— А ты яго потым бачыў?

— Як-жа, у, тое-ж лета на параходзе... Хвацкі хлопец!

«Сказаць ці не сказаць Тайдану пра чорнага?»—думаў Сымонка.—«Ён нікому ня скажа, не сказаў-жа пра матроса».

Толькі Сымонка хацеў пачаць апавяданьне пра чорнага, як Стэпа крыкнула ў дзьверы.

— Тайдан, выйдзі хутчэй! Пятро Васільлевіч прыехаў!

Сапраўды праз хвіліну заіневаны, у багатай хутры, укаціўся ў хатку апякун прытулку, купец Пётра Васільлевіч.

— Стары здароў! Усё папраўляеш, падбіваеш?—жартаваў апякун.

— Але-ж даводзіцца: не малая сямейка; па боту, дык сорак ботаў, а па пары—вось колькі будзе!—жартаваў у адказ Тайдан.

— Прывяжы Саураску ды сена кінь... Сама ў доме?

— Была ў доме, ды пэўна, і зараз там, куды-б ёй падзецца!—сказаў, апранаючыся, Тайдан.—Сымонка, зьбегай да загадчыцы.

— Не, навошта бегчы, я сам пайду: вось толькі пакуначкі на санях; занясі іх да Кацярыны Астахаўны,—сказаў Пётра Васільлевіч, атрасаючы сьнег з бабровага каўняра.

Сымонка кумілём кінуўся на двор да саней. «Ня іначай—цукеркі,—меркаваў ён бяручы з саней пакункі.—Што яму: свая фабрыка, нічога не каштуе».

— Апякун! Пётра Васільлевіч!—крыкнуў Сымонка ў майстэрню, бягучы з пакункамі ўгору.

Як прусакі, павыбеглі хлапцы на ганак, шумелі, крычалі, радваліся. Як-жа: новы чалавек прыехаў!

Міколку з Сымонкам прыезд апякуна быў асабліва прыемным: пра іх зусім забудуцца, не давядзецца даваць тлумачэньні ні загадчыцы, ні майстру.

Дзяўчаты, сьпяшаючыся, прыбіралі ў пакоях, хлопцы ў майстэрні купамі ставілі нарыхтаваныя кошыкі: начальства, пэўна, аглядаць пойдзе.

## V

## ГОСЬЦІ

Пётра Васільлевіч захацеў пазнаёміцца з афіцарамі кавалерыйскага атраду, што стаяў у Чырвоным Яры, і ад іх даведацца пэўных навін пра ворага—пра ненавісных бальшавікоў: у горадзе быў настрой трывожны, шмат казалі—пра посьпехі чырвоных—нібы ня сёньня—заўтра яны наскочаць і захопяць горад. А можа яны і ня так ужо блізка, можна пасьпець, куды-небудзь уцячы ў менш небясьпечнае месца.

І вось Кацярына Астахаўна запрасіла афіцэраў на « шклянку гарбаты». У пакоі яе стол быў засьцелены па-сьвяточнаму: бела-

сьнежны абрус, белыя талеркі, срэбныя лыжкі. На кухні, завіхаючыся, смажылі, секлі, гатавалі...

Смачны пах смажанага мяса, гарачай кавы павіс у кухні, прайшоў у сталовую; там хлопцы неахвотна даядалі за вячэраю рэшткі пракіслай юшкі, што засталася ад абеду, і кухенныя пахі раздражнялі іх.

Жэўжык Рыгор крычаў дзяжурным дзяўчатам:

— Зоська, ці хутка катлеты падасі?

— Адарка, чаму кавы не разьліваеш?

— Як-жа! Вялікія паны! «Катлеты», добрыя і без катлет!— мімаходам адказвалі дзяжурныя.

— Думаеш ня ўмею катлеты есьці? Дай на спробу, убачыш!

— Ня еў ці што? Бацька быў жывы, усё сваё было: карова, куры, парсюкі. Яшчэ лепш елі «ні вялікія паны»!.. Ах, ты, падлізьніца!—патрос кулаком Рыгор.

Хлопцы выскаквалі з-за стала, зазіралі на кухню, дражнілі дзяжурных.

— Ой, ой! Хто гэта? Вось зладзеі!—крычала Стэпа на кухні.

— Сьцягнулі! З патэльні сьцягнулі катлеты... Вось непражорныя лантухі!.. Ну, што я цяпер буду рабіць?

Зьявілася Кацярына Астахаўна.

— Хто катлеты сьцягнуў? Прызнавайцеся. Усё роўна даведаюся, потым, горш будзе. Ну?

Усе маўчалі.

— Ты, Яцура? Табе ўсё мала!

— Я?! Ды ў хлапцоў запытайце. Вось Андрэйка тут сядзеў, Сымонка... Я і з-за стала ня выходзіў. Усё на мяне! Дзяўчаты зьелі, а я вінаваты...—апраўдваўся Яцура...

— Ды мы з-за стала ня выходзілі, каб зараз памёр!—кляўся Рыгор.—Вось хоць Зоську спытайце. Зоська, выходзілі мы з-за стала?

Рыгор быў цьвёрда ўпэўнены, што Зоська калі і бачыла, дык ня скажа: ведала, што ёй за гэта пападзе.

— Я выходзіла, ня бачыла,—выкруцілася Зоська.

— Ну дык і ведайце, што я вам усё роўна ня веру. Пётра Васільлевіч прывёз цукерак, але вы іх не атрымаеце... Дзяўчатам будзе, а вам не... Свавольнікі! Ну, на малітву і спаць! Заўтра ледзь сьвітаць будзе, пабуджу вас і за працу,—холадна загадала Кацярына Астахаўна.

Хлопцы не варушыліся.

— Чаго чакаеце?—Устаць!—крыкнула загадчыца.

— Катлету-б?—Нехта сьмяючыся крыкнуў з цёмнага кута.

У Кацярыны Астахаўны забілася сэрца, яна пачырванела, але яна змаўчала, нібы ня чула.

Прасьпявалі пахмура малітву і разыйшліся—дзяўчаты на другі паверх, а хлопцы ў сваю спачывальню, дзе, не распранаючыся, ляглі на ложак паляжаць, бо спаць нікому не хацелася.

Ды й не да сну было! Дзень выйшаў нейкі нядобры: шмат крыўды, няпрыемнасьцяй. Хацелася нешта зрабіць, пасвавольнічаць, камусьці адпомсьціць...

Гошка з Яцураю прыдумвалі самыя фантастычныя пляны, як-бы сьцягнуць катлеты ці што-небудзь смачнае, бо раздражняльны пах з кухні дайшоў і ў спачывальню і дражніў цяпер пустыя жываты.

Пайшлі ў кухню, сунуліся ў дзьверы, але яна, як выявілася, была замкнутай з сярэдзіны качаргой.

Каля Міхалкі Козыра сабраўся гурток, шапталіся, камусьці пагражалі, як нейкія страшныя змоўшчыкі.

Цікаўны Сымонка што час бегаў на гару і кожны раз паведамляў змоўшчыкам:

— Ядуць катлеты... А цукерак колькі! Чаркі стаяць!

У Яцуры ад такіх паведамленьняў у жываце ўсё пераварачвалася.

А ў Гошкі ўжо новы плян гатовы.

— Ведаеш, Яцура, вывернем хутры, сажаю намажамся ды й прысочым дзяўчат пад сходкамі—напалохаем!

Сказана—зроблена!

Апрануліся, намазаліся і прытуліліся пад сходкамі ў цёмных сенях.

Рыпнулі дзьверы: ідуць!

Гошка выскачыў з засады.



Дзяржаўная бібліятэка БССР імені Леніна
Инв. 1953 г. Б№ 4836

— Ай, хто тут?—дзікім голасам зароў Сымонка.

— Тфу! Сымонка!—плюнуў Гошка.—Выходзь Яцура, ня вышла!

— Чэрці, папалохалі! На афіцэра-б напалі, ляжалі-б без галавы... Адзін там выхапіў шаблю, выхваляўся, па дзесяцёх, кажа, германцаў засякаў, а чырвоных—па паўсотні адразу.

— Ого-го!

— Чырвоныя, кажа, недалёка ды баяцца іх няма чаго, яны ня страшныя нам: яшчэ шаблі нашы вострыя, кажуць, коні хвацкія, а вось свае ў нас, кажа, чырвоныя,—гэта больш небясьпечна; вось іх нам трэба пералавіць... Калі, кажа, ведаеце якіх бальшавікоў—скажэце, мы іх, кажа, жыва, бяз суду! Вось!

У Гошкі мурашкі па скуры забегалі... Ён не аднойчы сашчапляўся з-за чырвоных з Міхалкаю Козырам, які быў за белых. Рэшта хлапцоў ўсё—куды Міхалка; толькі Міхалка, з Сымонкаю супроць іх ішлі, з Гошкаю разам былі, ды Жыхарка часам, на злосьць Міхалку, пераходзіў да Гошкі.

— Каву п'юць і віна падліваюць!—прыносіў новыя весткі Сымонка.

Яцура пакутваў. Ён закручваў галаву коўдраю, каб ня чуць паху, які салодка раздражняў.

— Што гэта? Нібы сьпяваюць?

Прыслухаліся: сьпявалі дзяўчаты ўгары. Звонкія галасы дзяўчат хвалявалі змоўшчыкаў. Ім здавалася, што там, угары, сьветла, цёпла, весела, а іх туды ня пушчаюць.

— Дзяўчатам цукерак далі, сьпяваць прымусілі,—зноў прыносіў весткі Сымонка.

— Сымонка, чорт, ці ляжаш ты спаць, толькі дражніш!—лаяўся Яцура.

— Не пайду больш, вытурылі мяне і дзьверы на засаўкі замкнулі. Што, кажуць, усё сочыш, нібы шпік які.

Угары зайграў грамофон, пачулася топаньне ног, столь затрэслася.

— Скачуць! Чакай, заўтра даведаюцца!—пагражаў кулаком у столь Міхалка.

На вуліцы завыў вецер, застукалі вакяніцы, ля вакон узьнялася завіруха.

Над галавою застукалі абцасамі, нібы шрот сыпаюць, столь мацней затрэслася.

— Афіцэры скачуць ці апякун разышоўся. Што ім! Наеліся ўсяго досыць, упіліся, чаму-ж не скакаць! Чэрці!—вылаяўся Сымонка.

А там пляскалі далонямі, засьмяяліся, загаварылі...

— Вось, каб падпаліць, паскакалі-б тады! — засьмяяўся Міколка.

— Вось здарава-б!—падтрымаў Жыхарка. — Мне ані ня шкода!

Угары затупалі, пачуліся галасы ў сенях.

— Выходзяць!

Сымон адчыніў дзьверы ў сені, па нагах прайшоў холад. Чуў, як разыходзіліся госьці, заспакойвалі Кацярыну Астахаўку: баяцца няма чаго, атрад у іх у дзьвесьце шабляў.

— Пасьля вашых гутарак і ноч спаць ня будзеш,—адказвала Кацярына Астахаўна, замыкаючы дзьверы.

Чутно было, як у гары, сьпяшаючыся, прыбіралі, нешта выносілі ў камору.

Зарыпелі брамы—гэта Тайдан зачыняў іх за гасьцямі.

Усё замоўкла, толькі прыкра стукалі вакяніцы, ды вецер дзіўней цягнуў свае песьні.

## VI

## ТРЫВОЖНАЯ НОЧ

Кацярына Астахаўна загасіла лямпу. Ноч была цёмная— хоць вочы выкалі. Страшныя малюнкі бальшавіцкае лютасьці, пра якую расказвалі госьці, паўставалі прад вачыма Кацярыны Астахаўны.

Страх усё больш скоўваў яе, і яна з галавою ўкрылася коўдраю. За вокнамі—стагнала, галасіла і нехта ўпарта трос вакяніцы.

Нешта рыпнула—няўжо дзьверы? Прыслухалася—ціха. Адлягло ад сэрца.

Зноў наляцеў вецер, загрымеў жалезам па даху.

«Па даху ходзяць!»—падумала Кацярына Астахаўна і ўся пахаладзела, застыгла.

Дах зноў загрымеў: ходзяць! А што, калі чырвоныя! Можа афіцэры праваронілі?

Зашаптала пацеры, захрысьцілася. Са страхам успомніла, што не зачыніла вакно на гары—бялізну сушылі, а вакно не дагадаліся зачыніць.

Цяпер ужо пэўна ведае Кацярына Астахаўна, што ходзяць па даху: не адзін, ня два, а шмат... А там праз пастку ў камору, а замкі ў ёй нікуды ня варты.

Нешта грукнула над камораю.

— Божа! Няўжо? Хоць-бы памерці раней, бяз катаваньняў!..

Паднялася на лакцёх: чутна, у каморы варушацца, сходкі рыпяць..

Адчувае Кацярына Астахаўна, як валасы на галаве ўзьнімаюцца.

— Закрычаць, пабудзіць хлопцаў? толькі напалохаеш, а дапамога якая-ж? Шандор унізе, Тайдан у сваёй хатцы...

Ледзь перамагла страх, пабудзіла няню.

— Што, што такое? Пажар?—ускочыла з перапуду няня.— Дзе? Дзе? Ой, божа!

— Ды цішэй ты, Аўдотачка! Хадзем да мяне.

— Што такое, матухна? Што ты спакою не даеш.

— Слухай, слухай! Залезьлі па даху.

Няня прыслухалася: лютаваў вецер, дах грымеў, недзе грукнула.

— Ну што ты, маці мая, бач, якая бура, таго і глядзі, што дах зьнясе, а ты ўжо і «залезьлі». Хто можа залезьці, што ў нас—скрыні багацьця ўсякага, ці што?

— Ды слухай: у каморы!

Прыклаліся вухам да сьцяны.

— Мышы напэўна, ці кошка,—спакойна заўважыла няня.— Што тут выдумляць, сапраўды?

— Не, Аўдотачка, мне здаецца...

— Перажагнайся, матухна, дык і здавацца ня будзе. Ці ня выпіла ты з гасьцямі?

— Ввы-вы!—праімчалася за вакном.

— Тыр-тыр-тыр!—паўтаралі вакяніцы.

— Бач, якая завіруха, а табе здаецца—лезуць... Ідзі, маці, кладзіся спаць, досыць табе ўжо выдумляць!—бурчэля няня, выходзячы да свайго пакою.

Кацярына Астахаўна лягла і адчула, што ўстаць ня можа. Сілы пакінулі яе, у скроні стукала, ногі пахаладзелі.

Новыя грукаты ў каморы, тупат ног па даху, як калацьцё іголкі, адбіваліся ў мазгох Кацярыны Астахаўны, а з апошнім грукатам дзьвярмі, недзе зусім блізка, яна страціла прытомнасьць.

## VII

## СЬЛЯДЫ

Стэпа выйшла раніцою даіць карову. На ганку, на нанесеным сьнезе—сьвежыя сьляды.

— Хто-ж гэта ноччу хадзіў, ці не зладзеі?

Пайшла хутчэй у пуню,—ці тут жывёла, не зьвялі яе? Карова і конь былі на месцы.

— Ня іначай, як Тайдан хадзіў,—супакоілася Стэпа і занялася сваёю справаю.

Потым пайшла ў камору па муку, адчыніла дзьверы і пачала лаяцца:

— Ах, бадай іх, гэтых катоў! Што нарабілі!

На падлозе ляжала разьбітая цёрла масла, крупы рассыпаны; соль таксама, наогул у каморы поўны вэрлах.

— Вось нячыстая сіла!—лаялася Стэпа.—Ды і пастка-ж адчынена... Гэта дзяўчаты ўчора лазілі па бялізну, не зачынілі. Ах, бадай іх зусім!..

Пайшла сказаць. Тарганула дзьверы—замкнуты.

— Вось сьпяць да якое пары...

Пастукала мацней.

— Што трывожыш ні сьвет, ні зара?—нездаволена сустрэла няня.—Захварэла сама, галавы не падніме... Ноччу ўсё здавалася, што зладзеі лезуць, дык з перапуду, відаць і лягла...

— Якія там зладзеі! Каты дурэлі. Ідзі вось, паглядзі,— і Стэпа павяла няню ў камору.

Прачнуліся вялікшыя дзяўчаты, выбеглі.

— А цукеркі дзе? Я ўчора іх тут паклала!—закрычала Зоська.

— І пірага няма,—абвясьціла Даша,—я вось сюды, у кошык паклала! І хлеба няма!

— Няўжо зладзеі? Божа, зьлітуйся, паратуй!—усхвалявалася Стэпа.

Пабеглі па Тайдана, па Шандора, агледзілі на гары, дах, двор.

Сьвежыя сьляды былі на даху і на двары.

Абудзілі хлапцоў і ўсе прыбеглі,—войкаюць, вохкаюць, мітусяцца, дагадкі выказваюць.

— Ужо ці ня нашы зладзеі тут пахадзілі?—выказала сваю думку Стэпа,—каму патрэбны цукеркі, падумайце самі.

Хлопцы кляліся, што ноччу ўсе спалі, як забітыя, нічога ня чулі.

— Ды вось хоць сьляды памерым,—злаваўся Рыгор,—а то зладзеі, зладзеі!

Спачатку трэба справу высьветліць. Ну, вось, глядзеце—падыходзяць?—крычаў ён ставячы нагу ў сьлед.—Яцура, станавіся! Гошка! Міколка!

Хлопцы па чарзе мералі свае ногі па сьлядох, і калі камісія па расьледваньню, якая складалася з Тайдана, Шандора і Стэпкі, падыйшла, сьляды ўжо значна павялічыліся ў сваіх памерах.

— Хіба гэта хлапцоўскія сьляды? Тут вось якія?—Абурваўся Рыгор.

— Але-ж паводле сьлядоў тут ня йначай, як слонь хадзіў. І дзе яму такія валёнкі змайстравалі—нібы жартам, нібы сур'ёзна сказаў Тайдан.

Сьляды ішлі да рыны.

— Па рыне залязалі—бачыш?—даводзіў круцель Дзёмка.

— Бачым, што па рыне, ды назад-жа як? Не на крыльлях-жа паляцелі?—разважала камісія.

— Спальню абшукаць!—злосна сказаў Шандор.

— Ідзеце шукайце! Што, думаеце, баімся?—пакрыўдзіўся Яцура..

Усе ўвайшлі ў хлапцоўскую спальню. Хлопцы скідвалі на падлогу сяньнікі, падушкі, трэсьлі коўдры. Такі пыл узьнялі, што ледзь бачылі адзін аднаго.

— Ну вось, глядзеце... Што—ёсьць?—кпілі хлопцы.—Што мы—зладзеі, ці што?..

У спальні нічога не знайшлі.

Ухвалілі нікому не казаць, пакуль не палепшае загадчыца.

## VIII

## У ЛЕСЕ

Калі ўсе крыху супакоіліся, майстар Шандор загадаў хлапцам ісьці ў лес па дубцы. Шандор вельмі зьдзівіўся, калі хлопцы пайшлі бяз усякіх спрэчак, а раней, пакуль ня ўмешвалася начальнічка, хлопцы ня ішлі.

Папрасіўшы ў Стэпы па кавалку хлеба, узяўшы па нажу і самадзельныя лыжы, усе вырушылі ў дарогу.

Пасьля ночнае завірухі дзень быў ціхі, сонечны, вясёлы. Белы сьнег бліскаў на сонцы, пераліваючыся рознакалёрнымі іскрамі, лёгкі мароз пашчыпваў за нос і вушы. Лыжы лёгка коўзаліся па сьнезе.

Дзень разьвесяліў хлопцаў. Наўздагон імчаліся яны з высокага манастырскага ўзгорку на шырокую даліну ракі, за якою пачынаўся лес.

На ўзьлесьсі спыніліся.

На манастырскім двары, дзе стаяў атрад, гарністы заграў збор.

З брамы выехала некалькі коньнікаў; у кожнага ззаду па адным незасядланым кані. Паехалі па лясной дарозе.

— Давай, хлопцы, пасядзім, пабачым, куды салдаты паедуць,—сказаў Міхалка.

Усе згадзіліся. Хутка наламалі сухіх сукоў, гальля—запалаў агонь. Ухвалілі падмацавацца.

Рыгор выцягнуў з-за пазухі заверчаныя ў анучку цукеркі, Дзёмка—кавалкі масла, Паўлюк—пірага.

— Лоўка мы справу абрабілі!—пахваліўся Рыгор.

— Так ім і трэба!—пагразіў кулаком Міхалка.

— Перад Тайданам толькі сорамна. Ён ведае, што лазілі ў камору, але-ж маўчыць,—сказаў Міколка,—я ледзь яму не сказаў.

— Скажы толькі, такога часу дадзім, што ў другі раз не захочаш,—гразіў Міхалка.

Зноў заграў гарністы ў манастыры.

— Ня іначай, як чырвоныя блізка, вось і выступаюць,—сказаў Яцура.—А што, калі-б чырвоныя зараз зьявіліся, што-б мы рабілі?

— Біцца-б пачалі,—сказаў Міхалка.

— А я-б, не. Я проста перабег-бы да іх,—сказаў Гошка.

— Яны цябе адразу на вілкі возьмуць; думаеш, глядзець на цябе будуць?—палохаў Міхалка.

— Брахня гэта ўсё! Я чырвоных нікольні не баюся, а ты баішся: скажы, не баішся?—захадзіўся Рыгор.

Палітычная спрэчка была перарвана стрэламі ў лесе.

— Страляліна! Няўжо чырвоныя ўжо?—спалохаўся Міколка.

З манастырскае брамы выехаў атрад кавалярыстых, спусьціўся з берагу, галёпам паймчаўся па дарозе ў бок Іркуцкага тракту.

Пачуліся яшчэ стрэлы і гулкае рэха разьнесла іх па лесе.

— Ну, хутчэй дубцоў трохі нарэжам, ды і дамоў,—загадаў Міхалка.

Усе разыйшліся па лесе.

Міколка з Сымонкам пайшлі ў бок да манастырскае хаткі: трэба аднесьці хлеба чорнаму. Нядарам-жа ўчора Міколка лазіў з Рыгорам у камору.

Частка хлеба ў іх за пазухай, а частку ў двары пакінулі—потым занясуць.

Гошка пайшоў з імі.

— Добра, хадзем з намі,—сказаў Міколка.—Толькі ўмова—што ты ўбачыш, нікому ня скажаш.

— Памру—не скажу! А што такое?

Цікаўнасьць брала Гошку.

Недзе заіржаў конь.

— Конь заблудзіўся,—бач, як іржэ!—сказаў Сымонка.— Пабяжым, хлопцы. Ці ня Рыжка наш?

Пабеглі шпарчэй, як мага, выйшлі на дарогу галасы чутны. Недзе гаварылі людзі.

— Ці не зладзеі зводзяць? Коні заўсёды жаласна іржуць, калі зладзеі; яны-ж адчуваюць, — выказваў сваю думку Сымонка.

Пайшлі па дарозе, галасы правей. Зыйшлі з дарогі да раўка. Каля лесу ўбачылі прывязаных засядланых коняй. Прайшлі далей—у рове прывязаны да дрэва высокі шэры конь непакойна аглядаецца па баках, тупае на адным месцы, іржэ, круціць галавою, хоча вырвацца. Крыху паводаль ляжаць два забітыя коні.

Ляснуў поруч затвор вінтоўкі.

— У галаву цэль, каб адразу... Навошта мучыць жывёліну?—Казаў мужчынскі голас.

Хлопцы ўбачылі трох салдат: адзін цэліўся ў каня з вінтоўкі.

— Навошта забіваеце?—ня вытрываў Сымонка і падбег да салдат.

— Сапсаваная... Каб ня трапіла да чырвоных д'яблаў,—адказаў салдат.—Адыходзь? Чаго прышоў?

— Нам-бы лепш аддалі, — загаварыў Міколка, — мы-б вылечылі.

Конь круціў галавою, біў нагамі.

— Не забівайце! Аддайце нам, мы з прытулку,—ужо ўсе разам прасілі хлапцы.—У нас зусім стары конь, ледзь цягаецца. Аддайце.

Салдаты задумаліся. Вінтоўка апусьцілася. Ім і самім шкода забіваць Чалдана, ды загад такі—нічога ня зробіш.

Сымонка падбег да каня, пагладзіў па грудзёх, па баках.

Конь заіржаў, мацней закруціў галавою, часта тупаў нагамі, нібы патрабаваў: ці каб не цягнулі доўга, хутчэй забілі, ці каб адвязалі і далі волю.

— Аддаць ці што?—запытаў салдат з вінтоўкаю ў іншых.

— Аддайце, мы яго вылечым,—ужо больш настойліва прасілі хлопцы.

— А вы нас не падманеце?

— А калі камандзір убачыць?

— Ня ўбачыць! Ніхто нават ня ўведае, мы яго схаваем спачатку тут у лесе, а ноччу адвядзем да сябе. У хляве на зіму паставім! Аддайце!

— А, ну, добра, усё роўна, сёньня выступаем. Бярэце, хлопцы, так і быць, толькі ад чырвоных д'яблаў хавайце.

— Добры конь, толькі на заднія ногі прыпадаць пачаў, а тыя былі зусім хворыя паказаў салдат на забітых.

Ён адвязаў каня і перадаў Сымонку.

— Ну, толькі ўмова—вы засыпце забітых сьнегам—сказаў другі салдат, перадаючы рыдлёўку.

Селі на коні і праімчаліся.

## IX

## НАДЗЕЙНАЕ МЕСЦА

Чалдана вывелі на дарогу; дрыжыць, палахліва азіраецца па бакох, нібы ўсё яшчэ ня верыць у свой ратунак, усё нечага баіцца—ці не схаваліся дзе бязьлітасныя гаспадары.

Павялі дарогаю. Конь крыху прыпадаў на заднія ногі.

— Абпоены—сказаў Сымонка.—Гэта глупства, разы два серкаю гарачаю папаіць, і ўсё—хутка палепшае.

— Куды павядзем?—запытаў Гошка.

— У хатку, што ў лесе. Куды-ж болей? Там ёсьць надзейнае месца.

Узыйшлі на сьцежку і гужам ішлі да самае хаткі.

У хатцы нікога ня было, печка ледзь-ледзь цёплая. Каня прывязалі да ганку.

Рашылі, што Міколка з Гошкаю пойдуць дамоў па сена, а Сымонка застанецца з канём.

Было ўжо холадна. Сымонка зьмерз. Назьбіраў каля хаткі трэсак, хацеў запаліць у печы, ды запалак ня было.

— Ня зьмерзну,—падумаў Сымонка і пачаў скакаць па хатцы, крыху сагрэўся. Выйшаў да Чалдана, гладзіў яго, прыгаварваючы.

— Хутка сена прынясуць—наясіся, а дома аўса здабудзем. Улетку на кургане пасьвіць будзем, там трава добрая.

Чалдан стаяў ціха, нібы разумеў, што трэба маўчаць, бо могуць пачуць.

Сымонку зрабілася холадна; зноў пайшоў у хатку—усё-ж ня так холадна.

Раптам конь запырскаў, занепакоіўся.

«Ці не адбіраць каня прыехалі? А можа воўк»,—падумаў Сымонка і выбег з хаткі.

«Нікога! Што за дзіва: Чалдан не спакойны».

Сымонка пайшоў вакол хаткі—ці не схаваўся хто.

«Нікога».

— Эй, хлопчык!—чуе Сымонка голас, а чалавека ня відно.

— Ды сюды, сюды!—пачуўся з-за куста той самы голас, і чорная, калматая шапка паказалася над кустом.

— Га, гэта вось хто,—пазнаў Сымонка чорнага чалавека, што ўчора яму ногі адціраў, і пайшоў да яго.

— Хто ў хатцы?—ціха спытаў чорны.

— Нікога!

— А конь чый?

— Наш!

— Слухай, хлопец, ня хлусі, кажы праўду,—сурова сказаў чорны, узяўшы Сымонку за грудзі.

Сымонка перапалохаўся.

— Праўда, дзядзечка, нікога няма, толькі я адзін. Зараз Міколка з Гошкаю па сена пайшлі.

— Хто гэта Міколка і Гошка?

— Нашы хлопцы. Міколка, што ўчора тут са мною быў, а Гошка такі-ж, як і Міколка.

— А конь?—ужо мягчэй запытаў чорны.

— Конь папсаваны. Салдаты забівалі, а мы выпрасілі. Там два забітых у рове за карагаю.

Чорны павесялеў.

— Гэта я знарок злаваўся, папалохаць цябе захацеў. Так, добры конь. Малайцы, хлопцы!

— Каб, кажуць, чырвоным д'яблам не дастаўся—супакоіўшыся, расказваў Сымонка.—Прыпадае на заднія ногі, у паходзе нібы ня вытрымае. Казалі схаваць да ночы, каб камандзір ня ўбачыў, бо ім пападзе, і каня адбяруць. Яны сёньня выступаюць, вось і забівалі.

— Адкуль ты ведаеш, што выступаюць,—спытаў чорны.

— Салдаты казалі, ды мы і самі бачылі, як атрад за рэчку, да Іркуцкага тракту паімчаўся.

Зайшлі ў хатку. Чорны запаліў у печцы.

Сымонка перадаў чорнаму хлеб і масла.

— Вось за гэта дзякуй, браток. Сёньня мне ня было калі па хлеб схадзіць, ня еў яшчэ зраньня,—і чорны, загатаваўшы на печцы гарбату, узяўся за ежу. Сымонка таксама выпіў шклянку гарачай вады. Ён быў дужа задаволены, што яго хлеб трапіў у час. Расказаў пра сваіх учарашніх госьцяй, пра іх размовы аб чырвоных, якія ім ня страшны, а вось страшны свае бальшавікі—іх вось і трэба злавіць.

— Як ты думаеш, пакрышаць нашы чырвоных?—спытаў Сымонка чорнага.—Афіцэр казаў, што па паўсотні будзе сячы адразу... Што яны маленькія ці што? Ты ня бачыў іх?

— Даводзілася бачыць: гэткія-ж, як і мы з табою...—усьміхнуўся чорны.

— А шмат іх усіх?

— Хто-ж іх ведае! Прусакоў у хаце ніколі ня зьлічыць, так вось і іх.

— Мне-б хацелася пабачыць, якія там за чырвоныя. Ох, кажуць і сьмелыя! Толькі здаецца лютыя дужа, так горла і перагрызаюць, нікому літасьці няма. Міколка наш казаў, што, як чырвоныя прыдуць, нам канец: усё адбяруць, нас з прытулку вытураць. А стары Кундзюкоў нібы сам у горадзе чуў—у газэтах надрукавана, што яны ў Расіі нарабілі—папоў, кажа разагналі, а ў цэрквах тэатры парабілі, ды скокі ладзяць, а мужыкоў і баб у камунію загналі, ніводнага вольнага чалавека не засталося, а хто, кажа, уцячэ, таму антыхрыставу пячаць на лоб ставяць...

А назначанага ніхто ня прымае... Ён бегае, бегае ды з голаду і гіне...

— Ну, брат, гэтага я ня чуў; думаю, што гэта хлусьня. Ты ня ўсякай гаворцы вер. Можа хто і знарок хлусіць—так сабе, для страху, а вы і рады, што так страшна, і верыце.

— Як-жа ня верыць? Кажуць—значыць, праўда... Нешта хлапцоў доўга няма,—занепакоіўся Сымонка.

— Так, даўгавата. Ужо вечарэць пачынае. Ты таксама ідзі дамоў, а заўтра раніцою ўсе прыдзеце і возьмеце. Я яго тут у гушчары пастаўлю, каб ніхто ня ўбачыў. Сена з-за рэчкі прынясу, там цэлы стог стаіць.

Сымонка згадзіўся, толькі прасіў мацней прывязаць і павартаваць.

— Будзь пэўны! Я ля коняй умею хадзіць,—сказаў чорны.

Сымонка на разьвітаньне пагладзіў Чалдана па грудзёх.

— Бач, якое таўро, нібы грыўня,—падумаў Сымонка, разглядаючы чорны кружок на конскіх грудзёх. І яшчэ Сымонку кінуліся ў вочы ружовыя храпы Чалдана—прыметны конь, ня згубіцца.

— Бывай Чалдан!— разьвітаўся Сымонка з канём і пайшоў па сьцежцы дамоў.

## X
## НЕСПАДЗЯВАНАЕ ЗДАРЭНЬНЕ

Спачатку Міколка з Гошкаю меркавалі сьцягнуць сена з Кундзюкоўскага двара, які выходзіў да самага лесу, але, успомнілі, што Сымонка мала ўзяў хлеба для чорнага чалавека, надумаліся прайсьці да прытулку, узяць схаваны хлеб і набраць сена.

На двары прытулку стаяла гарадзкая фурманка. Пад павецьцю два салдаты лупілі забітых кароў—Красуню і Машку.

— З гораду ад Камітэту Пётра Васільлевіч прыслаў,—сказалі плачучы хлопцам дзяўчаты.—Усё роўна, кажуць, чырвоныя прыдуць усіх пазабіраюць. Мяса ў горад павязуць.

Надзька, маладзенькая кароўка, застаўшыся адна аднэю ў пуні, страшным голасам рыкала. Падлетак бычок Васька вырваўся з загародкі, задраўшы хвост угару, ён бегаў па двары,

спыняўся, утупіўшыся дурнымі вачыма на сваю на палову аблупленую маці Красуню, прараэьліва рыкаў і зноў скакаў па сумётах сьнегу.

Але нядоўга скакаў Васька: хутка схапіў яго лоўкі салдат і закалоў, а затым павесіў на «пялах».

Стэпа з дзяўчатамі ў кухні глядзелі ў вокны і плакалі. Шкадавалі Красуню, Машку і Ваську.

Салдаты злажылі тушы на свае сані, а скуры на крытулькавыя. Давялося запрэгчы Рыжку і ехаць у горад. Разам з салдатамі за фурмана пасадзілі Міколку, а каб назад яму ня было сумна вяртацца, паехаў і Гошка.

Салдаты на сваім кані ехалі паперад, а хлопцы ззаду.

Калі зьяжджалі з Крутога Яру на рэчку, каб ехаць простаю дарогаю, насустрач трапіліся вясковыя хлопцы, якія весела крычалі бягучы:

— Салдаты выяжджаць!.. Усё кідаюць!..—і паказвалі патронныя торбы і старыя шапкі, якія яны цягнулі дамоў.

Пад гарою ўспомнілі пра Сымонку, потым прышлі да думкі, што конь да вечару не памрэ, а Сымонка ўвечары прыедзе конна адзін. Ды і раней можа прыехаць—камандзіру цяпер не да таго. Бач, уцякаюць!

Па той бок рэчкі, па Іркуцкаму тракту, імчаўся галёпам конны атрад.

А з гораду насустрач ішлі цэлыя абозы: вайсковыя і невайсковыя, з дзецьмі, з рэчамі, наганяючы адзін аднаго, на Чарамышынскую чыгуначную станцыю, каб з якім-небудзь цягніком выехаць чым далей. Усе сьпяшаліся, злавалі на коняй, лаяліся...

У горадзе таксама нязвычайны рух: грымела цяжкімі коламі артылерыя, афіцэры ў брычках, запрэжаных параю, шпарка імчаліся па Маскоўскаму тракту на Іркуцк. Вайсковыя хапалі рамізьнікаў, прымушаючы іх везьлі як мага хутчэй на станцыю; рамізьнікі хаваліся ад вайсковых, уцякалі на ваколіцы гораду.

Салдаты ў паходнай форме кудысьці ішлі невялічкімі атрадамі...

— Недзе ўсе едуць...—дзівіліся хлопцы...—значыцца, чырвоныя блізка.

— Стой! Што вязеш?—пачулі яны воклік.

Вартавы стаў на дарозе.

Салдаты нешта тлумачылі, паказвалі паперу.

Вартавы казаў адно:

— Да комэнданта! Нічога ня ведаю. Горад на асадным становішчы...

Хлопцы перапалохаліся: ужо ці ня чырвоныя ў горадзе? Цяпер, відаць, хутка і ня выедзеш.

Вартавы даў сыгнал.

З брамы Чырвонага будынку, каля якога іх спыніў вартавы, выйшла тры салдаты... Узялі коні за павады, увялі на двор і зачынілі вароты.

Міколка з Гошкаю зайшлі пагрэцца ў памяшканьне для вартавых.

## XI

## ЗАВІРУХА

Ужо зусім у змрок падыходзіў Сымонка да хаты. Ногі дрыжэлі, галава гарэла.

«Ня іначай, як застудзіўся—думаў Сымонка:—учора моцна зьмерз ды сёньня.... Нічога, да Тайдана на печку залезу,—міне!»

Усю дарогу шкадаваў, што ня ўзялі ўсіх коняй жывымі, аддалі-б салдаты, куды ім!

Сымонка больш за ўсяго любіў коні, і паводзіны Міколкі з Гошкаю абурвалі яго. Круцялі! Конь галодны, а ім хоць-бы што!

Вылае-ж ён іх, як прыдзе! Добра, што чорны прышоў, а так, што-бы ён рабіў? Не заблудзіліся-ж яны ў лесе: дарога вядомая. Так, пэўна, гуляюць дзе.

Падыйшоў да хаты. Брама расчынена насьцеж, хлапцоў нікога ня відна. Дзяўчаты з заплаканымі вачыма ходзяць па двары; Стэпа стаіць з Тайданам ля ганку, плача, у хвартух смаркаецца; Тайдан сумны, сур'ёзны, вочы не сьмяюцца, як заўжды.

«Ці не памерла Кацярына Астахаўна»,—падумаў Сымонка.

Яму зрабілася сумна.

«Куды згінулі Міколка і Гошка? Чаму іх ня відаць?»—і сэрца ў Сымонкі сьціснулася, ад страшнага прадчуваньня.

— Дашка, што тут здарылася?—запытаў ён стрэчную дзяўчыну.

Так замахала рукамі.

— Забілі абедзьвюх—і Ваську таксама...

Сымонку нібы абухом па галаве ўдарыла,—«Значыць, Міколку, Гошку і Васіля Варанкова»,—мільганула ў галаве Сымонкі страшная думка.

— Даўно, Дашка?

— Ды ўжо ў горад павезьлі.

«Натамаваць»—мільганула думка.

— Дзе, Дашка, дзе?

— Што дзе? Вось прычапіўся!—раззлавалася Дашка.

— Забілі дзе?

— Дзе, дзе—на двары, дзе-ж яшчэ!

Сымонка ўбачыў на сьнезе цемнаватыя крывавыя плямы, і ногі яго пахаладзелі. Ледзь дацягнуўся ён да Тайдана і ледзь чутна спытаў:

— Тайдан, хто Міколку з Гошкаю забіў і Васіля?

— Як забіў? Што ты хлопец? Хто хлапцоў будзе забіваць? Што ты вярзеш?—сказаў Тайдан і памацаў Сымонкаву галаву.—І сапраўды—брэдзіць, бач, галава гарачая. Набегаўся па лесе! Ідзі на печку ў хату ды пагрэйся.

— А Дашка кажа—забілі абедзьвюх і Ваську.

— Кароў забілі з цялём, дурны! А Міколка з Гошкаю ў горад паехалі—мяса павезьлі, а Васіль вось ён—нешта цягне.

У браму ўбег Васіль з двума салдацкімі кацялкамі і старым ботам.

— Салдаты ўсё пакідалі і выехалі?—Хутка сказаў Васіль,—там уся вёска!

Прыбеглі астатнія хлопцы з усякаю ўсячынай кінулі на ганак і зноў пабеглі да манастыра.

Сымонку адразу зрабілася лягчэй, але кароў было шкода і бычка Ваську.

Ногі яго дрэнна слухаліся, галава гарэла, а самому было сьцюдзённа.

— Пайду пагрэюся—рашыў Сымонка і пайшоў у хатку.

Хлапцы апярэдзілі сялян, бабку Кундзючыху, якая таксама бегла спатыкаючыся да манастыра, а можа што трапіць і ёй.

З рэчкі дзьмуў моцны вецер, лес шумеў, вакяніцы ля вакон стукалі, варожачы буру.

У манастыры ўсе з нейкім вясёлым уздымам абшуквалі хатку, дзе жылі салдаты, клеці. Цягнулі, што пад руку трапіць, вартае і нявартае, білі вокны, здымалі дзьверы, вынімалі рамы.

Айцец Анісім, манастырскі поп выйшаў было ўгаварваць народ, але натоўп сустрэў яго варожымі крыкамі і папу прышлося, падабраўшы крысы, бегчы ў сваю кельлю.

Падлеткам хацелася падпаліць спустошаныя хаткі, і ўжо Тодар крывы пачаў паліць запалкі, але з-за моцнага ветру ня мог.

У баку за рэчкаю прагучэў стрэл...

Нехта крыкнуў:

— Чырвоныя!

І ўвесь натоўп, як спалоханыя вараб'і з канапляньніку, рынуліся хто куды.

Зьбітая з ног Кундзючыха сьпяшаючыся зьбірала рассыпаныя патроны, некалькі старых шапак бяз казыркоў.

— Тфу ты, нячыстая сіла!—лаялася яна.—Старому чалавеку нідзе не дадуць. Праклятыя хлапцы!..

Вецер дзьмуў мацней, галасіў, залепліваў вочы сьнегам.

Хлопцы з прытулку, нагружаныя кацялкамі, патронамі, падранымі ботамі, заіржавелымі шаблямі, імчалі што сілы і ледзь ня зьбілі з ног Тайдана, які замыкаў браму.

— Чырвоныя ідуць!—Крычалі яны ледзь пераводзячы дух.

— Дзе? Якія чырвоныя? Чаўпеце вы няма ведама што!—нездаволена прабурчэў Тайдан.—А гэта адкуль, барахло гэта?

— Усё адтуль-жа... Ад салдат засталося.

— Эх, нажывеш бяды з вамі, хлапцы!

— Чырвоныя недалёка!—крыкнуў Рыгор, што прыбег апошнім.—Нашых, кажуць, абыйшлі, дарогу адрэзалі.

— Ну, хлопцы, гайда спаць, мала што кажуць,—сказаў Тайдан і замкнуў дзьверы.

Прышоўшы ў хатку, Тайдан запаліў капцёлку.

«Эх, завіруха ўзьнімаецца. Каб не паехалі хлопцы ноччу з гораду. Замерзнуць думаў Тайдан, седзячы за сваім варштатам.

Сымон спаў на печы і нешта мармытаў. Тайдан падышоў да яго, памацаў галаву, рукі... Сымон быў хворы і вёрз няма ведама што.

Тайдан прыслухаўся: хворы ўспамінаў нейкага Чалдана, чорнага, камору, хлеб чорнаму і зноў Чалдана.

«Бач ты, з-за каморы пакутуе. Таксама, відаць, лазіў,— падумаў Тайдан.—Але якога ён чорнага Чалдана ўспамінае? Можа які злодзей падгаварыў хлапцоў. Ці-ж доўга іх адурыць неразумных!»

Тайдан памачыў рушнік і паклаў Сымонку на галаву.

Вецер тужліва галасіў у коміне, рваў дах, грымеў жалезам. Тайдан пайшоў на гару наведаць загадчыцу. Кацярыне Астахаўне зрабілася горш—з сэрцам дрэнна.

Ніхто ня клаўся спаць, сабраліся ўсе ў калідоры ля печак, далей ад акна.

Прышлі з нізу хлопцы: баяліся быць унізе. Усе пасядалі на падлозе, маўчаць: у пакоі цёмна. Страшна. Колькі прасядзелі— невядома: здалося ўсім, што дужа многа.

Скрозь вый ветру чуліся нейкія галасы, нехта крычаў, страляў, нейкія коньнікі нібы пранесьліся міма дому. Стрэлы то аддаляліся, то ізноў набліжаліся. Да вакон падыйсьці ніхто не асьмельваўся—каб хоць не забілі.

— Дзе-ж нашы хлопцы?—зноў успомніў Тайдан пра Міколку і Гошку.—Каб ня трапілі на гэтую справу...

Усім зрабілася яшчэ страшней і нудней: дзяўчаты плакалі. Стэпа таксама.

Здаецца, і канца ня будзе гэтай ночы.

Але стомленасьць і перажытыя за дзень трывогі ўзялі сваё: хлопцы, хто як сядзеў, так і заснулі паступова.

Тайдан, прытуліўшыся да дзьвярэй, таксама заснуў.

Стэпа, утупіўшыся тварам у хвартух, храпела. А на вуліцы разгулялася сапраўдная завіруха: са злосьцю налятаючы на хату, яна, здавалася, гатова была разьнесьці яе да падмурка.

## XII

## ЗНАХОДКА

Міколцы з Гошкаю блізка паўгадзіны давялося чакаць, пакуль салдаты выйшлі ад камэнданта.

Прышоў памоцнік камэнданта, загадаў скуры скінуць на зямлю, а хлапцоў пусьціць...

— Можа-б пераначавалі хлопцы тут, ваша дастойнасьць?— запытаў памоцніка барадаты салдат,—а заўтра раніцою паехалі-б: а то, як-бы зноў на ноч завіруха не разгулялася...

— Ну, начаваць яшчэ! Што мы дарогі ня ведаем ці што! У хвілю даедзем!—сказалі хлопцы.

Памоцнік паглядзеў на іх і сказаў:

— Напляваць!

Хлопцы паехалі з двара.

За горад выехалі, калі ўжо зусім зьвечарэла. Дарогу замятала. Рэзкі халодны вецер біў насустрач.

— Нічога ня відна, глядзі, каб з дарогі ня зьбіцца,—сказаў Міколка, што кіраваў канём.

Гошка скруціўся абаранкам на дне саней? Міколка павярнуўся ад ветру сьпіною да каня і даў Рыжку волю самому шукаць дарогу.

Рыжка спачатку бег, потым пайшоў ціха, а потым зусім стаў.

— Н-но, Рыжка! Чаго стаў?—торгаў лейцамі Міколка.

Рыжка ня йшоў.

Павярнуўся Міколка, зірнуў пад сані:

— Так і ёсьць, з дарогі зьбіліся! Гошка, устань! Зьбіліся, далінаю едзем!—Крычаў Міколка зьлязаючы з саней.

— Сюды, тут цьвёрда!—паклікаў ён праз колькі хвілін і раптам пачуў нейкі стогн. Прыслухаўся—зноў стогне.

Пад'ехаў Гошка.

— Гошка, слухаў! Стогне?..

— Так, чалавек нібы стогне,—перапалохаўся Гошка.

Недзе далёка стрэлілі, потым яшчэ.

— У Чарамошніках вартавыя, няйначай,—сказаў Міколка—склады там...

Стогн пачуўся зусім выразна з боку ад хлапцоў. Накіравалі туды Рыжка па пульхным сьнезе. У сьнезе—чалавек. Абмацалі яго—шурпатая шынэль.

— Гэй, дзядзя, уставай,—замерзьнеш! Гэй, устань ці што, падвязем!—трос яго за плячо Міколка.

— Таварышы! таварышы!—ледзь чутно мармытаў у няпрытомнасьці чалавек.—Не забівайце... Ратуйце...

Схапіў Гошка яго за голую руку ды так і адскочыў:

— Рука замерзла! Як ільдзіна!

Паматаў руку Міколка:

— Нагатова адмарозіў!

Пачалі паднімаць чалавека на сані.

— Дзядзя падніміся хоць трохі!—Але чалавек не варушыўся. Падвялі сані да самага чалавека, зноў пачалі паднімаць.

— Няма сілы! Як камень,—з месца ня зрушыш!

А вакол—як у катле бурліць: вые, стогне завіруха.

Рыжка не стаіць. У хлапцоў зьнік усякі страх, яны ўжо не заўважаць жорсткага холаду, ня чуюць, што вецер, як нажамі, рэжа твар. У іх адна думка—як-бы падняць, павезьці выратаваць...

Недзе пачуліся галасы.

— Гэй, дапамажэце! Чалавек замерз!—закрычалі хлопцы.

Галасы бліжэй. Гэта з гораду вяртаюцца сяляне.

— Сюды! Сюды! Замярзаем!—што сілы закрычалі хлопцы.

Нібы знарок, з рыкам паляцеў вецер, падхапіў надрыўны дзіцячы крык і аднёс яго ў зусім другі бок.

Галасы ўсё далей, а потым і зусім змоўклі.

— Вось дзе дарога, каб толькі не забыць,—сказаў Міколка.

— Аднак, мы нічога ня зробім. Самі замерзьнем,—сказаў Гошка.—Паедзем, у Чарамошніках заявім—возьмуць.

— Таварышы, ратуйце... Не па сваёй волі. Таварышы!—Ледзь чутна шаптаў чалавек.

Гэта спыніла хлопцаў, разагнала іхныя сумненьні. Адразу зьявілася цьвёрдая думка.

— Не пакідаць!

Прыняліся церці сьнегам адмарожаную руку, твар, вушы. Нібы стала больш сілы. Удалося павярнуць чалавека на бок, зноў падвялі пад яго сані, навалілі яго на сані.

— Ох, гора з плеч!

Рыжка, намерзшыся, не стаяў, ірвануў і паймчаўся па сьнезе.

Выехалі на дарогу. Зноў пачуліся стрэлы.

«Няўжо чырвоныя!»—у хлопцаў пахаладзелі ногі.

Дзе яны самі, ці далёка хата?—Невядома, вакол густая цемра.

Раптам, перад самымі вачыма вырасла, на дарозе, зусім чорная, чорная сьцяна.

Сасновы бор манастырскі.

— Ого, хутка ў двары будзем!—узрадаваліся хлопцы. Міколка, торгаючы лейцамі, нокаў на Рыжка, а Гошка ўсё цёр сьнегам адмарожаную руку падабранага чалавека.

Прыехалі. Брама прытулку была замкнута, у хаце—цёмна. Міколка падлез пад браму, адчыніў яе і падвёў Рыжку да самых дзьвярэй Тайданавай хаткі.

— Тайдан! Тайдан!—крычаў Міколка.—Няўжо так моцна сьпяць?

Адчыніў дзьверы—Тайдана няма на печы. Сымонка сьпіць, нешта мармыча ўва сьне, на ваконцы капцёлка гарыць.

Сталі стукаць у дом, ніхто ня выходзіць.

— Вось сьпяць, сонныя!—лаяўся Міколка.

Адпраглі каня ледзь зацягнулі чалавека ў хатку. Гошка прынёс цэлае вядро сьнегу і ўсадзіў туды адмарожаную руку, а сам пачаў распранаць чалавека.

— Салдат, бач ты... малады... апрануты як цёпла...—разважалі хлопцы.

Зьнялі шынэль, валёнкі,—ногі цёплыя, не абмарожаныя.

Гошка прыклаў руку да салдатавых грудзей.

— Аджыве! Бач, сэрца як грае! Руку трэба адцірашь толькі: куды-ж бяз рукі!

— Можа ён чырвоны?—падаў думку Гошка.

— Хто яго ведае! Адкуль чырвоным быць у такую завіруху? Пусьці мяне, я патру руку.

— Трэба церці пакуль не пачырванее. Бач, ужо пачынае крыху—сказаў Гошка і з новаю сілаю цёр руку салдацкай шынэляй.

— Ой! Ой! Таварышы!—Крыху апрытомніў салдат.— Зьлітуйцеся не калеце! Ой, рука баліць! Таварышы!

Зноў стаў няпрытомным, пакінуў стагнаць, толькі грудзі пачалі ўздымацца вышэй і задыхаў часьцей.

— Няўжо памірае?—У Гошкі на вачох зьявіліся сьлёзы.

— Бяжы, Міколка, стукайся яшчэ, можа, пачуюць....

Міколка выскачыў з хаткі, у момант дабег да дому і што сілы застукаў нагамі ў дзьверы.

Завіруха выла, як раней.

— Адчынеце хутчэй! Чалавек памірае,—крычаў Міколка, трукаючы кулакамі ў дзьверы.

Угары рыпнулі дзьверы.

— Хто там?—пачуўся голас Тайдана.

— Тайдан, гэта я, хутчэй!..

— Як вы жывымі засталіся? На вуліцы жах які!—сказаў адчыняючы Тайдан.—Хутчэй, пойдзем, Тайданачка, памірае!

— Хто? Сымонка?—і хутчэй пабег да хаткі.

— Хто гэта такі?—зьдзівіўся Тайдан, убачыўшы на падлозе чалавека.

— Ня ведаем, за Чарамошнікамі ўзялі, ледзь самі не замерзьлі....

— Ох!—глыбока ўздыхнуў салдат.

— Ён памірае, Тайдан?—сумна запытаў Гошка.

Тайдан аглядзеў чалавека, памацаў грудзі, ногі, рукі.

— Якая рука гарачая—адцíралі?

— Як-жа? І там, і тут, і ўсю дарогу. Яна была, як ільдзіна—адказалі ўраз хлопцы.

— Жыць будзе! Здаровы хлапец: сьпіць зараз. Аслабеў,

мабыць, дужа... Ну, кладзецеся і вы спаць, затаміліся. Добра, што хоць жывымі вярнуліся,—раніцою разьбярэмся.

Колька з Гошкаю ў міг залезьлі на печ і лягглі побач з Сымонкаю.

Тайдан пакрыў салдата шынэляй, паклаў яму пад галаву падушку, патушыў сьвет і сам лёг.

Доўга варочаўся Тайдан на сваім ложку і ня мог заснуць. Сымонкаў брэд не даваў яму спакою: якому чорнаму Чалдану хлеба насілі...

«Ах, хлопцы, хлопцы,—уздыхаў Тайдан,—што ў іх толькі ў галаве!?».

## XIII

## НА ДРУГІ ДЗЕНЬ

Прачнуўшыся, Стэпа была дужа зьдзіўлена: на падлозе ў калідоры спалі хлапцы і дзяўчаты, сама яна чамусьці таксама спала ў куце ля печы.

Успомніла ўчарайшае,—апусьціліся рукі.

— Хоць-бы сьмерць хутчэй,—менш было-б пакуты.

Пасядзела, прыслухалася—ціха. Асьцярожна падышла да акна,—на вуліцы нікога і насыпаны сьвежыя сумёты сьнегу.

Пайшла паглядзець сірату—Надзьку. Дарогаю зірнула ў Тайданаву хатку, там—царства соннае.

«Мабыць хто начаваць папрасіўся»,—падумала Стэпа пра незнаёмага салдата, што спаў на падлозе...

Усталі і хлопцы ў доме—зараз-жа да акна.

— Што за дзіва? Ужо ці ня сон страшны нам учора сьніўся!

На вуліцы ціха, сьветла. Сьнежныя сумёты ад яркага сонца—белыя аж зіхацяць.

— Аніякіх чырвоных!

Пабеглі ўніз на кухню—усё, як было, закіпае вялікі самавар, Стэпы няма,—значыцца, пайшла паіць карову.

Паімчаліся да Тайдана.

— Тайдан, чырвоных ня было?—крычаў Жыхарка.

— Ціха!—папярэдзіў Тайдан і паказаў на салдата.

Хлопцы разам прыціхлі.

— Гэта чырвоны?—цікавіўся Жыхарка.

— Ня ведем і самі—адказаў Тайдан.

— Хворы, паранены?—пыталі хлопцы.

— Абмарожаны, хлопцы ўзялі на полі, Міколка з Гошкаю.

Сымонка, які ўжо ачуняў, зьлез з печы, даўно разглядаў салдата, мацаў шынэль, пояс, шапку і спакойна сказаў.

— Не, гэта ня чырвоны: нашы салдаты ў гэткіх-жа шынэлях ходзяць і паясы гэткія-ж.

— Ну, ня трывожце, хлопцы, хай сьпіць,—сказаў Тайдан, падштурхваючы хлапцоў вон з хаткі.

У сталовай за гарбатаю абмяркоўваліся ўчарайшыя падзеі. Міколка з Гошкаю з абмарожанымі шчокамі і насамі былі героямі дня. Усе дзівіліся іхняй сьмеласьці і адвазе.

— Чалавека выратавалі, апоўначы, у завіруху. Ледзь самі не замерзьлі, а ня кінулі.

Нават Міхалка Козыр на гэты раз не ганарыўся, а звычайна-ж ён дазваляў хваліць толькі сябе.

Выратаваны салдат быў яшчэ слабы. Хлопцы ўцягнулі ў Тайданаву хатку яшчэ ложак, набілі сенам два мяхі і паклалі хворага.

Даглядаць хворага выклікаліся дзяўчаты. Салдат да абеду праляжаў не варушычыся.

Па абедзе Сымонка з Жыхаркаю накіраваліся ў лясную хатку па Чалдана.

Міколка шапнуў Сымонку, дзе ўзяць хлеба для чорнага.

Беглі што сілы. У лесе было ціха. Ледзь адшукалі занесеную сьнегам сьцежку.

Вось і хатка. Каля—ніякіх сьлядоў.

У Сымонкі здрыганулася сэрца. Зайшлі ў хатку—нікога, печ ня палена.

Абыйшлі вакол хатку—сьлядоў няма; зірнулі ў кусты, у гушчары—ні чорнага, ні каня...

— Зьвёў! Значыцца, круцель і жыў,—расчаравана сказаў Сымонка.—А я яму яшчэ хлеба прынёс!

— Можа, зусім і ня круцель, а чырвоныя схапілі яго і павялі разам з канём.

— А сьляды дзе?

— Сьляды?—сьнегам замяло... Ноччу вунь якая завіруха была.

Сымонка быў гатовы заплакаць ад крыўды.

Пайшлі назад. Па дарозе зайшлі ў манастыр: ці ня зьбег сюды конь? Нікога на двары не знайшлі. Там было поўнае разбурэньне. Дзьверы расчынены, а часам і адарваны, вокны павыбіваны.

— Дзе-ж чырвоныя? Набрахалі, значыцца...—сказаў Жыхарка, аглядаючы кожны кут манастырскага двара.

У Тайданавай хатцы сабраліся ледзь ня ўсе хлопцы. Толькі што перайшоўшы парог, Сымонка ледзь чутно паведаміў Міколку:

— Зьвялі!

— А чорны Чалдан?—спытаў Сымонку Тайдан, гледзячы на яго вачыма, якія ўсьміхаліся.

«Значыцца, Тайдан ведае, сказалі»,—падумаў Сымонка і адважыўся казаць проста.

— І чорнага няма!

— А хлеб?—тым-жа ладам, нібы ўсё ведаючы, дапытваўся Тайдан.

— Вось і хлеб назад прынёс,—і Сымонка выцягнуў з-за пазухі акраец хлеба і падаў Тайдану.—Учора столькі-ж аднёс.

Хлопцы вушам ня верацъ: Сымонка ўсё расказаў Тайдану. Ну, пападзе яму ад іх!

Тайдан па вачох бачыў, што хлопцы падазраваюць адзін аднаго і рашыўся ўсё зараз-жа высьветліць.

— Ніколі вам, хлопцы, не падмануць Тайдана! Я ведаю, хто лазіў у камору, я і тады ведаў, ды чакаў, пакуль вы самі ня скажаце. Ня добра, хлопцы! З-за гэтага Кацярына Астахаўна і зараз галавы ўзьняць ня можа, ня ведаю—ці застанецца жывою. Вось што вы нарабілі! І пра Чалдана чорнага ўсё ведаю, а мне-ж ніхто не казаў. Гэта я Сымонку зараз на слове злавіў. Наскрозь вас бачу, бачу, што ў вас і думках. Ну, тут усё сваё—хаваць няма чаго, справа мінулая—кажы, хто бачыў Чалдана?

— Мы, адказалі Міколка з Гошкаю і Сымонка.

— Які ён?

— Шэры, добры конь, толькі папсаваны, салдаты нам аддалі.

Тайдан, дзівячыся, зірнуў на іх: Чалдан, значыцца, конь, а ён думаў—чалавек; але ня выдаў сябе.

— А чорны хто?

— Ня ведаем, селянін нейкі, у манастырскай хатцы ў лесе жыў.

Хлопцы ўсё, як ёсьць, расказалі Тайдану. Пакляліся, што ў камору лазіць болей ня будуць.

Тайдан абяцаў нікому не казаць, калі хлопцы стрымаюць сваё слова.

## XIV

## ЧЫРВОНЫЯ ПАДАЮЦЬ ВЕСТКІ

Прайшло два тыдні. Абмарожаны чалавек палепшаў, толькі правая рука крыху балела. Ён быў салдатам Калчакоўскае арміі; родам з сяла Багародзкага, што на рацэ Обі і там у яго толькі дзядзька, а больш ніякае радні.

Калі адступалі, ён адбіўся ад свайго атраду, у страшную завіруху зьбіўся з дарогі, завяз у сьнезе па пояс, ад нейкіх стрэлаў бег да лесу, урэшце ад стомы зваліўся і болей нічога не памятае. Апамятаваўся ўжо толькі ад гострага болю ў руцэ тут, у хатцы.

Хлопцы папрасілі загадчыцу пакінуць яго да вясны тут, у прытулку,—не аб'есьць іх, а шкода яго; зрэшты хай хлопцам даюць меншыя порцыі. Тайдан падтрымаў хлопцаў, і салдата пакінулі.

Кацярына Астахаўна ў горад баялася ехаць, ды і патрэбы асаблівай ня было, запас харчоў яшчэ быў.

Ніякіх чырвоных у вёсцы не зьяўлялася, і жыцьцё ўвайшло ў звычайныя рэйкі.

Хлопцы былі дужа расчараваны гэткім зваротам справы; чакалі-чакалі чырвоных, нешта павінна было адбыцца, ці лепш, ці горш,—а тут нічога.

Нібы завіруха, што праімчалася гэтаю ноччу: нашумела, напалохала, насыпала сумёты сьнегу і зьнікла.

Асабліва былі нездаволенымі Міколка і Сымонка з Гошкаю.

У апошніх зьнікла надзея вясною ўцячы з прытулку і разам з чорным пайсьці куды-небудзь далёка вандраваць.

Але раптам вёска захвалявалася, сяляне пачалі зьбірацца кучкамі, бабы забегалі з хаты ў хату з заклапочанымі тварамі.

Старшыня абвясьціў загад, атрыманы з гораду ад бальшавікоў, каб насельніцтва зараз-жа аддало ўсе рэчы і вайсковыя прылады, што захапілі, калі адступалі белыя. Хто не аддасьць, таму пагражала кара, аж да расстрэлу, а ўсю маёмасьць такіх асоб адбяруць у казну.

— Эх, хлопцы, казаў я, што з вамі грэху набярэшся, вось табе і набраўся,—бедаваў Тайдан.—Знойдуць у нас,—адкуль? Як трапіла? Вось табе і пад расстрэл! А каго?..—Ня вас, вядома,—вы яшчэ хлопцы дурныя, загадчыца хворая,—значыцца, Тайдана, больш няма каго.

— Тайданачка, мы аднясем, нічога табе ня будзе, усё да рэшты аднясем,—запэўнялі хлопцы.

Назаўтра хлопцы аднесьлі старшыні кацялок з патронамі і старую шапку з чырвоным кантам, а рэшту, дзесяткі паўтары новых кацялкоў, дзьве шаблі, стары рэвальвэр, колькі скрынак ладунак, пакінулі сабе і схавалі на майстэрні, угары, у сьмецьце... Шкода было разьвітацца з тым дабром: улетку ўсё гэта будзе патрэбна. Кацялкі—і рыбу лавіць, і па ягады, і юшку на беразе зварыць; з шабляў нажоў наробяць, а кулі на грузілы да судаў,—адным словам, нічога не прападзе, усё вельмі патрэбна.

Салдат таксама занепакоіўся: як-жа ён? Калі яго знойдуць— ня зьлітуюцца. Эх, толькі-б да вясны, а тады на параходзе да Багародзкага—хутка!

Доўга раіліся хлопцы з Тайданам і салдатам і ўхвалілі, што днём салдат з хаткі выходзіць ня будзе, каб вясковыя не сказалі каму, а калі будзе вобыск—яго схаваюць у скляпеньне за бульбаю.

Праз дзень і страх мінуў: з вобыскам ніхто ня прыехаў, у вёсцы ўсё супакоілася; у прытулку жыцьцё пайшло пастарому.

Хлопцы былі дужа рады, што так удала схітравалі з кацялкамі і з іншым.

Пацягнуліся ізноў бясконца даўгія дні. У майстэрні ў хлапцоў за копыкамі—ізноў лаянка і пагрозы майстра; у дзяўчат—угары, у часе латаньня бялізны, абіраньня бульбы,—штодзенна воркат Кацярыны Астахаўны, Стэпы.

Усім было ізноў пужліва, сумна. Хацелася зьбегчы кудынебудзь на волю.

Аднойчы, у часе абеду ў сталовую ўвайшлі дзьве маладыя жанчыны, апранутыя па-гарадзкому, падобныя да настаўніц.

Прывіталіся, пасядзелі, пакуль хлопцы палуднавалі, пакаштавалі стравы... Пайшлі ўгару, доўга гутарылі з загадчыцаю; потым склікалі дзяцей, зачынілі дзьверы, выпытвалі іх, як ім жывецца, ці добра кормяць, ці ня крыўдзяць...

— Чулі пра чырвоных?—пыталіся яны.

— Чулі,—адказалі хлопцы.

— Што-ж вы чулі?

Хлопцы ня ведалі, што сказаць... Калі сказаць, што пра іх на вёсцы кажуць, дык, можа ім гэта і трэба: зараз цап-царап!

— Ну, што-ж вы чулі?—паўтарылі яны.

— Народ яны, кажуць, рэжуць, а дзяцей на вілкі,—раптам выпаліла Манька-Варона, гэтак звалі яе хлопцы за крыклівы грубы голас.

Хлопцы так і пахаладзелі: што-ж гэта будзе?

Настаўніцы засьмяяліся.

— Хто-ж, па вашай думцы, чырвоныя: людзі ці не?

Ізноў маўчаць, а Манька, жадаючы выратаваць усіх, дакладна пераказала вясковыя размовы:

— Ну, людзі! Кажуць, афіопы нейкія!..

— А што такое эфіопы?—запыталася, сьмяючыся, адна з настаўніц.

Манька зьбянтэжылася і пачырванела.

— Брэша яна... Вось варона!—раззлаваўся Гошка,—што на вёсцы брэшуць, дык і яна...

— А ты ведаеш, хто такія чырвоныя?—запытала яна Гошку.

— Чырвоныя—гэта, што за працоўных, бальшавікі,—сьмела адказаў Гошка.

— Правільна! Хто табе сказаў?

— Ніхто, я сам ведаю,—крыху засароміўся Гошка!

— Бацька ў цябе ёсьць?

— Ня ведаю, цяпер ці ёсьць... Быў на вайне, ды ў палон трапіў. А дзе цяпер, невядома.

— У каго яшчэ бацькі ёсьць?—запыталася адна з настаўніц.

— У Дашкі татка ёсьць, а болей ні ў кога,—адказаў за ўсіх Гошка.

Сымонка дужа зацікавіўся—хто яны. Нарэшце і ён асьмеліўся.

— А вы ад чырвоных?—запытаўся Сымонка.

— Вы з імі і прыехалі?

— Не, мы тут жылі.

— Значыцца, вы да іх перайшлі?

Настаўніцы засьмяяліся.

— Ды мы-ж гэткія чырвоныя, як і тыя, што прышлі.

— Гэткія-ж,—зьдзівіўся Сымонка.—Дык дзе-ж вы жылі? Якжа вас салдаты не засеклі?

— Як дзе жылі? У горадзе. Пакуль нас было мала, мы хаваліся, а цяпер і хавацца няма чаго: нас шмат.

— Толькі жанчыны хаваліся ці і мужчыны?—запытаўся Сымонка, а ў самаго ў галаве круцілася—можа і чорны быў з чырвоных, хаваўся ў лесе.

— Ды чаму табе так цікава? Былі і мужчыны і жанчыны.

— Так, нічога,—засароміўся Сымонка і замоўк.

— Дык вось што, дзеці: мы бачым, што вам пра бальшавікоў, пра чырвоных шмат розных страхаў набрахалі. Ня верце— гэта брахня! Вось той хлопчык правільна сказаў—бальшавікі, гэта тыя, хто за працоўных... Яны, чырвоныя, самі рабочыя і ёсьць, сяляне, беднякі. Яны хочуць, каб беднякоў больш ня

было... Вы чые дзеці?..—Беднякоў, таму вы і ў прытулку. Гэтак чырвоныя і хочуць, каб перш за ўсё было добра дзецям беднякоў—вось як вы: каб яны былі апрануты, накормлены, вучыліся, весяліліся, каб яны былі вольнымі, разумееце—вольнымі! Вас ніхто ня можа караць, крыўдзіць. Мы да вас прышлём другога загадчыка, вам з ім будзе лепш. Ваша загадчыца сама кажа, што ўжо яна старая, цяжкая, для яе гэтая праца. Бачыце, у вас усюдых бруд, сырасьць, закурана ўсё... Абразоў поўныя куты навешана, а карысьці колькі ад іх? Вы над гэтым ніколі не падумалі? Падумайце!

Настаўніцы аглядзелі ўсе пакоі, абяцалі праз тыдзень яшчэ наведаць і пайшлі.

Хлопцы правялі іх да брамы. Шмат каму яны дужа спадабаліся.

— Вось, каб да нас гэткіх настаўніц! Добра-б!—Сказаў Гошка.

Міколка з Жыхаркаю, Сымонкам і яшчэ некаторыя хлопцы былі гэткай-жа думкі.

Міхалка падаў нядобрыя думкі пра настаўніц і яго прыхільнікі—Васіль, Яцура і іншыя—таксама.

Дзяўчаты спачатку маўчалі, але па вачох было відаць, што яны на баку Гошкі, аднак, баючыся супярэчыць Міхалку, сказалі, што яны і Кацярынай Астахаўнаю задаволены.

Пасьля пад'езду настаўніц Кацярына Астахаўна загадала вялікія абразы вынесьці, а малыя пакінуць.

Міхалкавы прыхільнікі запротэставалі... Знарок вымылі стары аблезлы абраз, умацавалі ў куце, упрыгожылі піхтавымі і кедравымі галінкамі, павесілі лямпадку, дзяўчаты рабілі тое самае: упрыгожылі ў сваёй спальні абразы. А ўвечары, пасьля вячэры, з асаблівым захапленьнем сьпявалі модлы; дзяўчатам падпявалі Міхалка і яго хэўра.

Гошка з Жыхаркаю і Міколка цяпер пасьмялелі і пачалі супярэчыць.

— Ды канцe вы, абрыдла ўжо! Галосяць, галосяць!—За гэта Кацярына Астахаўна прагнала з ганьбаю ўніз.

## XV

## У ЧАКАНЬНІ

Увесь дзень на заўтра чакалі, што прыедзе новы загадчык,—ня прыехаў; на трэці—таксама; прайшоў тыдзень, другі—нікога!

— Брахня!—зьдзекваўся Міхалка з Гошкі.—Вось табе сыты і апрануты! Вабразы папсавалі, адразу відаць, што бязбожнікі!

Пакуль што хлопцы адчувалі сябе бяз усякага начальства. Кацярына Астахаўна і слова сказаць баялася: «Хто яго цяпер ведае, паводле новых парадкаў, каб адказваць ня прышлося!»

Хлопцы зусім яе ня слухаліся.

Нават Шандору, які пагразіў у майстэрні хлопцам, Міколка дзёрзка адказаў:

— Зачапі толькі паспрабуй! Чырвоныя-ж недалёка!—і Шандор толькі мармытаў па-свойму, але «паспрабаваць» не асьмельваўся.

Толькі Тайдана хлопцы яшчэ слухаліся.

— Думаеце чырвоныя за ўсякія выбрыкі вас па галоўцы будуць гладзіць?—дакараў ён свавольным хлопцам.—Не, за свавольства яны ня надта хваляць!

Па вечарох да Тайдана прыходзіў стары Кундзюкоў. Хлопцы карысталіся выпадкам паслухаць навін, якія ён прывозіў ці з гораду, ці са станцыі. Кундзюкоў лаяўся, што «тавары» замучылі прызначэньнямі, конік замардаваўся, дый сам без адпачынку.

— Прыгон які! Ну, але-ж чакай...—казаў ён.—Чуў, Тайдан, пападзейкінскія ніхто ня выехаў, ніводнага каня не далі. Прабагародзкіх гавораць, што камісараў прагналі, а на Барабе— што-о! Ня ведаю ці верыць, ці не!..

— Багародзкія сьмелыя!—сказаў салдат.—Франтавікі там, зброі шмат панахавана ў іх усякае. Аднак вясною разгарыцца справа, ня йначай...

— Ну, як не разгарыцца! Толькі мяркую, дарма,—сказаў Тайдан.—Ужо калі да нас дайшлі ды ўсіх генэралаў з войскам

патурылі на ўсход,—значыцца, моц! А што супроць іх багародзкія!

— Адным толькі начаць!—заходзіўся Кундзюкоў.—Я-б таксама на старасьці год, думаеш, глядзеў-бы—ды хай яны згінуць!

— Ведама, пачаць толькі,—падтрымаў салдат,—сяляне ўсе нездаволены...

— Ты ўжо, хлопец, лепш ані шэй!—заўважыў Тайдан,— А калі сяляне былі здаволенымі? Мяркую, трэба пачакаць ды паглядзець: кепска будуць кіраваць таварышы, тады іншая справа, а зараз вайна...

— Ня ведаю, што будзе!—махнуў рукою Кундзюкоў і пайшоў дамоў.

У спачывальні доўга ішлі ціхія гутаркі: у адным куце Міхалка, Яцура і іхныя прыхільнікі абмяркоўвалі кундзюкаўскія весткі, цалкам былі на баку багародзкіх і ўжо малявалі сабе перамогі ў будучым, а ў другім Міколка з Сымонкам шапталіся:

— Эх, Чалдана шкода, які конь! Цяпер ужо паправіўся-б... Каб ня той валацуга, мы-б наезьдзіліся на ім.

— А мне чорнага шкода,—сказаў Міколка.—Я думаю, што ён не валацуга. І відаць, сьмелы... Люблю сьмелых! Нікога не баіцца, няма ім ніякага страху!

Міколка, памаўчаўшы крыху, зноў зашаптаў.

— Вясной пайшлі-б з ім па розных гарадох... табе ня хочацца куды-небудзь далёка зайсьці—за мора, на край сьвету! І прыслаць ліст хлопцам, што засталіся. Яны будуць думаць, што згінуў дзе-небудзь, а ім усё і апісаць—дзе быў, што бачыў... Я мяркую,—усюды ёсьць людзі, нельга згінуць.

— А калі да людаедаў трапім,—зьядуць!—сказаў Сымонка.

— Да людаедаў? Ну, людаедаў можна абмінуць.

— Абмінуць іх як-жа! Яны, братка, хітрэйшыя за цябе. Яны ўсе дарогі ведаюць,—станоўча казаў Сымонка, нібы сам толькі што вырваўся з людаедзкіх кіпцюроў.

— А я ўсё-ж уцяку адсюль. Тут, як у турме. Ты ня быў, Сымонка, ў турме?

— У турме? За што я туды траплю, я-ж ня злодзей, здаецца?—пакрыўдзіўся Сымонка.

— А я быў. Там пасодзяць чалавека і на замок, і няма яму ані ўваходу, ані выхаду. Да ветру захочаш,—рабі ў ражку, нібы малы. Ваконца высока, пад стольлю, ды і тое маленькае з кратай. Я два гады ў турме жыў. Дзядзька ў мяне там наглядчыкам. Калі нап'ецца п'яна, усё крычыць: «Я цябе, падлюга, у пяты нумар пасаджу, будзеш шкодзіць!»

— А што гэта пяты нумар?—запытаў Сымонка.—Страшна?

— Ой-ой-ой! Я, братка бачыў... Прывезьлі аднаго разу нейкага, вартавыя ў кантору адвялі, а дзядзька з імі—ён дзяжурным быў. А калі дзядзька дзяжурыў, вартавыя заўсёды мяне пускалі разам з ім. Вось прывялі таго ў кантору—допыт здымаць. Начальнік злосны быў. Я прытуліўся ў калідоры, каб начальнік не заўважыў... Чую, там як закрычаць, нагамі затупаюць! Мне захацелася пабачыць, што робіцца ў канторы і на каго там крычаць. У дзьвярох шчыліна была. Бачу—там афіцэр жандарскі і начальнік, а перад імі стаіць арыштованы, бляды такі.

— Ніколі,—кажа,—не даведаецеся пра маіх таварышоў.

— Скажаш, брэшаш! Згноім цябе тут,—гэта начальнік на яго.

— Згнаіць,—кажа,—можаце, а таварышоў ня здраджу,—а сам так глядзіць на начальніка сьмела, нібы яму нічога ня страшна...

Начальнік яшчэ больш раззлаваўся, загадаў закуць яго ў кайданы і закрычаў!

— У пяты яго! Вось у пятым пасядзіць, там мякчэй будзе!

Я прытуліўся, павялі яго міма мяне, а я ўсьлед за ім. Зыйшлі ў сутарэньне. Цёмна, нічога ня відаць.

Дзядзька доўга адмыкаў: дзьверы заржавелі. Я думаў, што канца ня будзе.

Адамкнуў нарэшце, зарыпелі дзьверы, а там—цемра. Штурхнулі закутага, ён закрычаў:

— Тут мокра!

А дзядзька зарагатаў:

— А ты думаў—цябе ў пакой прыгожы вядзем, бач ты!—і замкнуў дзьверы. Другі наглядчык таксама засьмяяўся:

— Нішто,—кажа,—астыне, шоўкавым будзе.

Зьняволены што сілы стукаў у дзьверы, крычаў,—ніхто нават і ня глянуў...

— Разумееш, Сымонка, як я раззлаваўся на дзядзьку, на ўсіх людзей!..

— Каб сіла была, разьбіў усе-б гэтыя скляпы, турмы. Наглядчыкаў-бы гэтых... Ня ведаю, што-б з імі зрабіў!

Міколка замоўк; чутно было, як у яго скрыганулі зубы.

— Ну, а што-ж з тым, закутым,—здрадзіў ён?—дазнаваўся Сымонка.

— Ня ведаю. Я тады хутка ад дзядзькі ўцёк. Там хіба даведаешся? Як трапіць туды чалавек, ды нібы і на сьвеце яго ніколі ня было. Потым, калі вадзілі туды закутых, глядзеў, ці няма таго,—ня было.

— Ведаеш, Сымонка,—зашаптаў зноў Міколка,—уцячэм! Гошку падгаворым!

— Ну, ён, як палахлівы заяц, усяго баіцца. Вось ці не паклікаць з сабою салдата, усё-ж ён вялікі,—прапанаваў Сымонка.

— Салдата нельга, ён чырвоных баіцца, яго могуць злавіць. І так, кажа, начамі здаюцца яму чырвоныя, з шаблямі за ім гоняцца, вось-вось засякуць.

— А куды ў нас, Міколка, шаблі схаваны?—успомніў Сымонка.

— За комінам над майстэрняю закапаны. Трэба нам па нажу зрабіць з іх, без нажа нельга ўцякаць.

Доўга яшчэ ішлі такія размовы ў спачывальні, пакуль сон не агарнуў дзіцячыя галовы, ня спыніў іхныя адважныя замеры.

## XVI

## НОВЫ ЗАГАДЧЫК

Мінуў месяц. Марозныя туманныя дні зьмяніліся на ясныя сонечныя. Дзе-ні-дзе на палёх абталі купіны, на якіх вароны і гракі чысьцілі свае дзюбы.

Рыгор, заўзяты галубятнік, усё часьцей і часьцей пачаў зьнікаць з майстэрні і прападаў цэлыя гадзіны ў Тайданавай хаце, дзе ў яго ў галубятні дзьве чубатыя галубкі сядзелі на яйках.

— Рыгорка, кошык рабіць трэба,—бурчэў Шандор.

— Ну дык што, я не раблю, ці што? Выйсьці нельга!—агрызаўся Рыгор.

І Тайдан усё часьцей выходзіў з свае хаткі, глядзеў на неба, на сонца, на шпакоўні.

— Вось-вось шпакі павінны прыляцець,—казаў ён хлопцам, і твар яго расплываўся.

— Вясна ідзе!

У адзін з такіх дзён у прытулак зьявіўся незнаёмы чалавек, спытаўся загадчыцы.

Сымонка павёў яго да Кацярыны Астахаўны і чуў, як ён сказаў:

— Я—новы загадчык.

Праз хвіліну па ўсіх кутках неслася:

— Новы загадчык!.. Новы загадчык!..

А Сымонка праз двор бег ужо да Тайдана, адчыніў крыху дзьверы і крыкнуў:

— Новы загадчык!..

Манька-Варона паглядзела ў шчыліну дзьвярэй і расчаравана казала дзяўчатам, што абсталі яе навакол:

— О-о! Нейкі просты мужык... і нажа ў яго няма ніякага і вілак ня відаць...

— Дурная!—аблаяла яе Зоська,—брашы, брашы... у каморку захацела!

— А хоць і ў каморку пасадзяць—не баюся! І богу буду маліцца! Буду! Буду! І ў камунію не запішуся! Што яны са мною зробяць?

— Маўчы, Манька!—зашапталі ёй дзяўчаты.—Каб з-за цябе і нам не папала!

Расчыніліся дзьверы. Дзяўчаты адскочылі, як апечаныя.

— Гэта вось нашы дзяўчаты,—пазнаёміла Кацярына Астахаўна.

Загадчык прывітаўся. Аглядзеў спальню, зыйшоў уніз да хлопцаў, у майстэрню.

Хлопцы прыціхлі.

— Як сыра тут і брудна!—сказаў загадчык—даўно бялілі?

— Два гады ня белена,—не даюць ні грошай, ні вапны, што-ж зробіш?—адказала Кацярына Астахаўна.

Пайшлі ў спальню, дзе зьбіта стаялі ссунутыя ў кучу дваццаць ложкаў і толькі ля самае сьцяны можна было праходзіць.

— Тут яшчэ сырэй,—паціскаў плячыма загадчык.

Увечары, пасьля вячэры зыйшліся ў сталовай. Новы загадчык распытваў у хлопцаў, як каго завуць, адкуль яны, ці ёсьць бацька і маці, ці даўно ў прытулку.

Спачатку хлопцы неахвотна адказалі, баяліся, каб не сказаць лішняга, каб чаго ня здарылася, бо невядома, для чаго пытае.

Загадчык расказаў пра сябе, адкуль ён, дзе быў, што бачыў. Хлопцы даведаліся, што ён ледзь ня ўсю Сібір абыйшоў, усякіх людзей бачыў, у іншых старонках бываў. Тут і хлопцам захацелася расказаць пра сваё жыцьцё.

Жыхарка сказаў, што ён ва ўсіх гарадзкіх прытулках пабываў.

— Ну, і што-ж?—спытаў загадчык.

— Нічога,—усюдых аднолькава.

— Добра ці кепска?

— Кепска. Усё-ж у хаце лепш. Там маці, прынамсі, кожнае сьвята...

Але Жыхарку ня далі дагаварыць, усе пачалі самі ўспамінаць пра сябе.

Успаміналі дом, бацькоў, матак, сясьцёр. Зоська, самая старэйшая з дзяўчат, заплакала, успомніўся сваё цяжкое жыцьцё на вуліцах гораду па сьмерці маткі. Міколка расказаў пра дзядзьку-турэмніка: ён да дзядзькі ніколі ня пойдзе, хоць абсып яго золатам—нізавошта!

— Ну, хлопцы, досыць сумных успамінаў,—сказаў загадчык,—што было, тое прамінула... Ваша жыцьцё наперадзе. Трэба быць сьмелым, вясёлым і бадзёрым. Засьпяваем лепш песьню. Вы якую ведаеце?

— «Сені»!—сказаў, сьмяючыся, Жыхарка.

— «Сені»? Ну, «Сені», дык «Сені». Пачынайце!

Сьпявалі «Сені», потым пасумавалі з «Калоднікаў», перайшлі зноў да вясёлых песень; усе разыйшліся. Рыгор выйшаў з кругу і пусьціўся ў скокі.

Усё закончылі агульным карагодам.

— Ну, і хопіць для першага знаёмства,—час ужо спаць! Дабранач, хлопцы!

— Дабранач! Прыемнага сну!—крычалі хлопцы, разыходзячыся па спачывальнях, задаволеныя і вясёлыя.

Стэпа і Тайдан гаварылі пра загадчыка.

— Дзіўны нейкі,—заўважыла Стэпа.

— Так, дзівак! А хлопцам люба, ды й нам нішто.

У сваёй хатцы Тайдан знайшоў салдата, які схаваўся на гары, калі даведаўся, што прыехаў новы загадчык.

— Ну, як? Пра мяне ня было размовы—пытаўся ён стрывожана.

— Я мяркую, што табе і баяцца няма чаго. Вясёлы чалавек, відаць сардэчны.

— Ну, ім толькі павер! Не, пакуль ня буду паказвацца, а ты як-небудзь да рэчы запытай: як, значыцца, салдат, які, калі адбіўся ад сваіх,—што з ім зробяць?

— Добра, спытаю, ня трывожся, — супакоіў Тайдан. — Ён, пэўна, заўтра яшчэ ў горад паедзе... так прыяжджаў—паглядзець, азнаёміцца.

## XVII

## ЖЫЦЬЦЁ ПА-НОВАМУ

Неяк усё хутка пайшло само сабою: новы загадчык пасябраваў з хлапцамі, хлопцы з ім.

Кацярыну Астахаўну назаўсёды праводзілі ў горад; дзяўчаты для парадку паплакалі, але праз гадзіну пасьля ад'езду ўсе ўжо і забыліся пра яе, бо ў гэты дзень ўсё было нязвычайна новае.

Сталовая была перароблена ў залю для сходаў. Усе пасядалі паважна за сталамі, нават малыя Санька і Цімка сядзелі важна за пярэднім сталом і чакалі, што будзе.

Тайдан, Шандор, Стэпа і няня,—усе былі тут.

— Трэба абраць старшыню сходу і сакратара, які будзе запісваць усё, што мы тут пастановім,—прапанаваў загадчык.

— Каго старшынёю?

— Тайдана!—закрычалі хлопцы—Тайдана!

— Міхал Тодаравіч!—паклікаў загадчык Тайдана,—сядайце вось за гэты столік.

Тайдан засароміўся, і ня ведаў, як яму быць і што рабіць: можа жартуе ўсё загадчык? Толькі вузкія, як шчылінкі, вочы, схаваныя ў прамяністыя зморшчкі, выказвалі яго радасьць.

Сакратаром абралі Андрэйку, самага ціхага хлопца, хоць самым пісьменным з усіх лічыўся Міхалка.

Стэпа з няняй сядзелі ля печкі і нічога не разумелі.

Загадчык абвясьціў, якія пытаньні будуць абмяркоўвацца на сходзе.

Старшыня ня ведаў, як весьці сход, усе ня ведалі, што гаварыць, а сакратар ня ведаў, што пісаць. Загадчыку давялося на ўсе тры фронты разрывацца.

Першае пытаньне—упарадкаваць і вычысьціць усё ў доме сваімі сіламі—вырашана было аднагалосна.

Санька падыманьне рукі зразумеў так, нібы гэта хлопцы мераюцца, хто вышэй, устаў на стол і ўзьняў абедзьве рукі:

— Вось я які! Дзядзя, глядзі!

— Так, так, вялікі,—засьмяяўся загадчык, здымаючы яго са стала; засьмяяўся і ўвесь сход.

Другая справа—трэба перанесьці працу з дому ў сапраўдную майстэрню, там, дзе зімою стаяла быдла, а для каровы зрабіць стойла пад паветкаю.

— Гэта трэба для таго,—растлумачыў загадчык,—каб нам было вальней, і каб нагары астаўся адзін вольны пакой, дзе мы ўсе разам будзем зьбірацца ўвечары. Але, хлопцы, адна ўмова: мы павінны будзем зрабіць усё самі, сваімі рукамі. Уявеце вы сабе, што мы—на бязьлюдным востраве, як Робінзон Крузо. Чулі пра такога?

— Чулі, чыталі!—адказала некалькі галасоў.

— Вось, значыцца, усе мы Робінзоны, разумееце? І спадзявацца нам няма на каго, апроч саміх сябе. Але нам лепш,

чымся Робінзону: у яго нічога ня было, у нас ўсё ёсьць; трэба толькі працаваць. А ведаеце савецкі закон: «Хто не працуе, той ня есьць»? Гэта значыць: хто хоча есьці, той павінен папрацаваць! Правільна гэта?

— Правільна!—згадзіліся ўсе, і Санька з Цімкаю крычалі:—Правільна!

Тайдан асьмеліўся сказаць пра салдата, момант трапны, хлопцы падтрымаюць.

— Яшчэ-б пытаньнейка адно,—нясьмела сказаў Тайдан.

— Калі ласка, якое пытаньне?—запытаўся загадчык.

— Салдат тут у нас, выратаваны хлопцамі.

— Які салдат? З Чырвонай арміі?

— Не... з белае...

Хлопцы ўсе застылі.

«Эх, дарэмна, Тайдан сказаў»—думалі яны.

— Хто яго выратаваў? Ад чаго?—зацікавіўся загадчык.

— Вось яны, Гошка з Міколкаю, абмарожанага падабралі ноччу, ледзь самі не замерзьлі,—адказваў Тайдан.

— Ах, вось як!—і загадчык зірнуў на Міколку і Гошку.

— Мы ня ведалі, што за чалавек, цемра была і завіруха,—апраўдваўся Міколка.

— Ого, зусім героі! А дзе-ж салдат? Ці ня можна паклікаць?

Хлопцы бачылі, што загадчык не ўзлаваўся, а хутчэй здаволены, што выратавалі чалавека,—павесялелі.

Паклікалі салдата. Той нясьмела ўвайшоў, прывітаўся.

— Добры дзень,—адказаў загадчык,—я і ня ведаў, што ў нас яшчэ і палонны...

Салдат зразумеў, што яго зараз зьвяжуць як палоньніка, і адправяць у горад—у турму.

Пабялеў, рукі задрыжалі.

— Вы куды мяне хочаце накіраваць? Я што-ж... чалавек... паднявольны, куды пасылаюць, туды і пайду. Ня пойдзеш—усё роўна куля...

— Я нікуды ня хочу вас накіроўваць, я ня ведаю вас, а вось, як сход скажа, куды вас...

— Пакінуць-бы ў нас, покуль,—нерашуча сказаў Гошка.

— Як, хлопцы? Ён—добры чалавек? Міхал Тодаравіч, вы яго ведаеце?

— Тайдан, пакінуць!—ўжо больш упарта казалі хлопцы.

— Пэўны хлопец!—сказаў Тайдан,—нам у гаспадарцы дапамагае.

— Значыцца, пакінуць?

Усе закрычалі:;

— Пакінуць! Пакінуць!

— Сядайце, вы цяпер роўнапраўны сябра нашага дому,—сказаў загадчык салдату.

Усім зноў зрабілася весела.

Ухвалілі працу пачаць заўтра з раніцы.

Званок дзяжурнага на вячэрнюю гарбату спыніў сход.

Санька скакаў па падлозе, пляскаў у далоні і крычаў:

— Я Лобінзон Пуза... Лобінзон Пуза!

Хлопцы сьмяяліся, а загадчык схапіў Саньку за руку, узьняў яго вышэй галавы і, сьмяючыся, сказаў:

— Ты яшчэ толькі Пуза, з Робінзонам будзеш пасьля!

Раніцою праца загула: хто сьцягваў ложак на двор, хто мясіў гліну, хто чысьціў майстэрню.

Хлопцы з запалам хапаліся за працу.

Загадчык, увесь апырсканы вапнаю, бяліў столь, сьцены.

Калі было ўсё замазана, выбелена, засталося самае цяжкое і няпрыемнае—мыць падлогу.

— Гэта праца, дзяўчат, мы ня будзем мыць,—сказаў Базыль.

Загадчык засупярэчыў, бо дзяўчаты працавалі таксама, як і хлопцы.

Прыцягнулі гарачае вады. Загадчык узяў анучу і запытаў, хто будзе мыць з ім вялікі пакой.

Хлопцам зрабілася сорамна. Падскочылі Міхалка з Гошкаю, выхапілі анучу ў загадчыка.

— Мы адны вымыем!

— Не, ужо вы мяне ня крыўдзіце,—пярэчыў загадчык, думаеце, мыць ня ўмею! Давайце, хто лепш!

Нават Міхалка Козыр, і той узяў анучу і пачаў мыць. А Міхалка дужа не залюбіў загадчыка, бо пры ім ніхто ўжо не баяўся Міхалкі.

Праз колькі дзён пазелянелыя ад сырасьці і пачарнелыя ад дыму пакоі нельга было пазнаць.

Брудная спальня хлопцаў зрабілася сьветлай сталовай, майстэрня—у добрую спальню! Угары звольніўся вялічкі пакой, дзе што вечар, пасьля працоўнага дня пачыналіся гутаркі, казкі, песьні...

Засталася толькі Тайданава хатка, якую пастанавілі прыбраць потым.

Такі выпадак скора надыйшоў.

Тайдана паслалі ў горад па тавар на боты.

— Ну, дзеці зробім Тайдану падарунак—вымыем яму хатку, пабелім,—прапанаваў загадчык.

Такую прапанову спаткалі з захапленьнем, і хлопцы і дзяўчаты разам узяліся за працу.

Усё Тайданава багацьце выцягнулі з хаткі,ператрэсьлі, расклалі на двары на сонцы.

Шандор з хлапцамі абмазалі шчыліны, салдат бяліў столь, печку. Загадчык з Міколкаю папраўлялі перагародку, наладжвалі дзьверы, устаўлялі ў рамы новыя шыбы. Санька-Пуза, як цяпер пачалі клікаць яго хлопцы, і Цімка стаялі на варце і глядзелі на дарогу—ці не пакажацца Тайдан, каб папярэдзіць хлопцаў: усім хацелася зьдзівіць Тайдана.

Да вячэрняй гарбаты праца была скончана; у хатцы стала чыста, сьветла, пахла смалістаю ельніцаю, па якую Сымонка з Жыхаркаю знарок хадзілі на «Сухую».

— Вось Тайдан ахне!—радаваліся дзеці, і ім абавязкова хацелася бачыць, як Тайдан адчыніць дзьверы ў сваю хатку.

Пасьля гарбаты хлопцы разьляглісь на адхонным даху сьвірна адпачыць на сонцы.

Вартавыя—Санька і Цімка, заўважыўшы Тайдана, закрычалі:

— Ідзе! Ідзе!—і пабеглі яму насустрач.

Хлопцы стрэлі яго ў варотах, узялі мех з таварам, і ўсе пайшлі да хаткі.

— Ах, каб вас зусім!—ускрыкнуў Тайдан,—няўжо я ня ў гэтыя дзьверы папаў: не мая хата! Хто-ж гэта падмяніў маю хату?—Зьвярнуўся Тайдан да ўсіх,—увесь зьзяючы ад радасьці.

— Твая! Твая!—весела крычалі хлопцы і пад рукі ўвялі Тайдана ў хатку, дзе заходзячае сонца іграла на сьценах і чыста вымытай падлозе.

Дзеці былі здаволены, што зьдзівілі Тайдана, а больш ім нічога і ня трэба было.

Так пачалі жыць па-новаму.

## XVIII

## НЕСПАДЗЯВАНАЯ БЯДА

Прыляцелі шпакі, зашумелі ручаі, сьнежныя сумёты пахіліліся. Правы бераг рэчкі абтаў і мясцамі абсох.

На гэтых сухіх мясьцінках хлопцы прастойвалі цэлыя гадзіны гледзячы, як выбіваецца на волю рэчка.

А было на што паглядзець!

З страшным грукатам, ламаючы лёд, вялікія крыхі, як дзікія зьверы, паўставалі, скрыгаталі краямі і затаплялі адна адну ў вадзе.

Цэлы дзень і ноч на рэчцы стаяў шум і гул. А раніцою лёду паменела, панесла дровы, бярвеньне, дошкі, а часам і адарваны баркас, плыты лесу...

Уся вёска выйшла на бераг. У каго былі лодкі, спусьцілі іх у ваду—лавіць бярвеньні і дровы.

Хлопцы таксама спусьцілі сваю лодку, і самыя сьмелыя—Рыгор і Яцура ўзяўшы багры і вяроўку, паплылі па здабычу.

Учэпяцца багром за бервяно і цягнуць яго да берагу, а тут ўжо арцель, на чале з загадчыкам, перахоплівае вяроўкаю і—на бераг.

Весела ішла праца, усе радаваліся з сонца, якое вызваліла з няволі рэчку, і з добрай дабычы.

— Хопіць, хлопцы!—закамандаваў загадчык, калі на беразе наклалі ўжо добры груд бярвеньняў і дроў.

Стомленыя і здаволеныя ўсе пайшлі да хаты.

Пад вечар рэчка ўжо зусім ачысьцілася, а на другі дзень раніцою хлопцаў разбудзіў параходны сьвісток.

Усе павыбеглі з дому паглядзець першы параход.

Загадчык з гэтым параходам паехаў дамоў, напомніўшы хлопцам, што сёньня трэба сячы дровы ў лесе.

Дзень выдаўся добры: цёплы, ясны.

Хлопцы з салдатам пайшлі ў лес пілаваць дровы. Пахла сасною, сьпявалі на розныя галасы птушкі...

На дарозе да манастырскага бору хлопцаў спынілі тры салдаты з вінтоўкамі.

— Стой! Далей нельга ісьці. Хто вы такія?—запыталі яны.

— Мы—з прытулку,—адказалі спалоханыя хлопцы.

— А гэта хто?—паказалі яны на салдата.

— Наш-жа... У нас ён жыве... З Багародзкага ён.

— З Багародзкага?—неяк многазначна паўтарыў адзін з салдатаў з чырвонай зорачкай на рукаве.

Салдат спалохаўся, пабялеў.

— Белы? Дакуманты!

Салдат адмоўна кінуў галавою.

— Даўно з Багародзкага?

— З восені яшчэ,—ціха адказаў салдат.

— Як з восені?

— Ды ён, дзядзечка, даўно ў нас жыве, з зімы,—умяшаўся ў размову Сымонка, жадаючы растлумачыць справу.

— То з восені, то з зімы! Блытаеце вы, вось што,—разлаваўся той, з зорачкаю.

— Ведаеш, што зараз у Багародзкім робіцца?—спытаў ён у салдата.

Той паківаў галавою.

— Няўжо бунт?!—выпаліў простадушна Сымонка.

— Адкуль ты ведаеш?—прычапіўся да яго з зорачкай.

— Кундзюкоў даўно яшчэ казаў, што як толькі рэчка рушыцца, будзе бунт...

— Хто гэта Кундзюкоў?

— Наш вясковы, да Тайдана ходзіць...

— А хто гэта за Тайдан, татарын ці што?

— Ды наш Тайдан, шавец наш,—сказаў Сымонка.

— Ага. Ну, разьбярэмся з усімі. Узяць яго!—паказаў з зорачкай на салдата.—А вы—марш назад. Ды жыва!—Загадаў ён хлопцам.

Салдата павялі да манастыра.

Хлопцы, спалохана шэпчучы між сабою, зайшлі ў лясок, потым павярнулі назад да манастыра—паглядзець.

— А чырвоных-жа колькі там, зірнеце! — ціха сказаў Міколка.

Сапраўды ля манастыра, на ўзгорку, цэлы атрад салдат з чырвонымі зоркамі на шапках, ставіў кулямёты, накіроўваючы іх у бок рэчкі, а другі атрад ланцугом абыходзіў сасоньнік, ахопліваючы ўсю вёску.

Хлопцы вярнуліся дамоў і толькі што пачалі расказваць Тайдану пра ўсё гэтае, як у вароты ўехаў невялікі атрад узброеных.

— Хто тут Тайдан?—запытаў старэйшы, той самы, што арыштаваў салдата.

— Я—Тайдан.

— Даўно ты быў у Багародзкім?—пачаў допыт старэйшы.

— У Багародзкім? Ды... год з пяць, відаць, будзе...

— А Багародзкія да цябе даўно заяжджалі?

— Зусім ня бывалі... ды я там нікога ня ведаю.

— Зусім нікога?

— Зусім...

У варотах паказаўся арыштаваны салдат пад вартаю.

— І гэтага ня ведаеш?—паказаў старэйшы на салдата.

— Ну, гэты ў нас жыве, працуе ў нас, дзеці знайшлі яго зьмерзшага, адратавалі яго, ён так і жыве.

— Пойдзеш з намі і ты. Апранайся!—суха сказаў старэйшы Тайдану і даў знак вартавому.

— Зрабіць вобыск!—загадаў старэйшы.

Чырвонаармейцы перавярнулі ўсё дном дагары ў Тайданавай хатцы, у пуні, у сьвірне. На майстэрні, пад сьмяцьцём, знайшлі дзесяткі паўтары новых кацялкоў, пачкі патронаў, дзьве шаблі і рэвальвэр.

— А гэта адкуль?—Запытаўся старэйшы ў Тайдана.

«Ну, цяпер мая песенька скончана,—падумаў Тайдан,—падвялі хлопцы».

— Ня ведаю,—сказаў ён голасна,—што хочаце рабеце са мною, а ня ведаю.

Запыталі салдата—ён таксама ня ведае.

Хлопцы перапалохаліся, і таксама ўсе сказалі, што і яны ня ведаюць.

Чырвонаармейцы, забраўшы ўсё, што знайшлі, узялі Тайдана і салдата і паехалі ў манастыр, дзе ў іх стаяў штаб атраду.

Арышт Тайдана зьбянтэжыў дзяцей, усе зьбіліся ў кучу—і хлопцы, і дзяўчаты.

— Што рабіць? Як выратаваць Тайдана?

Дзяўчаты галасілі. Зоська ўпікала хлопцаў за тое, што яны не сказалі чырвонаармейцам пра зброю, што гэта яны схавалі. Цяпер Тайдана судзіць будуць,—можа і расстраляюць.

— Праўду тады казаў Тайдан—успомніў Яцура,—«Каму адказваць? Тайдану». Так і сталася.

— Эх, дарма тады не аднесьлі ўсё гэта старасьце, цяпер-бы нічога Тайдану і ня было-б,—бедаваў Сымонка.

— А Тайдан ведаў, што мы схавалі, і не сказаў! Вось гэта чалавек!—з гонарам сказаў Міколка,—А мы што!

Дзяўчаты дамагаліся, каб хлопцы зараз-жа пайшлі да чырвоных і выручылі Тайдана.

— А яны і нас арыштуюць,—сказаў Жыхарка.

— Так вам і трэба,—хай арыштуюць, ня бралі-б чаго ня трэба,—злавала Зоська.

— Ага, ідзі сама! Вельмі сьмелая знайшлася,—агрызаўся Жыхарка.

— І пайду! Думаеш, не пайду? Зараз пайду! А вы баіцеся!

— Пойдзем, Зоська, і я з табою пайду,—рашуча сказаў Міколка і пайшоў з Зоськаю.

— І я з вамі,—далучыўся да іх Гошка.

— Вярнецеся лепш!—крычалі хлопцы,—усё роўна і вас расстраляюць!

— Ня вернемся... Трусы!—ужо здалёк крычала Зоська.

Зьвечарэла. Дзяжурны пазваніў на вячэру. Елі кепска, усім было не да таго. Усіх прыгнятала думка, што загубілі Тайдана.

Ужо позна прыехаў загадчык. Стэпа пераказала яму, што здарылася, сказала, што трое дзяцей пайшлі ратаваць Тайдана, ды так і ня прышлі назад.

Загадчык зараз-жа пайшоў у штаб, каб даведацца ў чым справа, і таксама ня прышоў назад.

Амаль усю ноч хлопцы ня спалі. Раніцою прышоў загадчык і дзеці, а Тайдана і салдата ня было.

— Учора ўночы іх павязьлі на параходзе ў горад,—паведаміў загадчык.—Ну, але-ж сумаваць няма чаго, іх хутка вызваляць,—бо ніякага праступку яны не зрабілі, непаразуменьне адно,—супакойваў ён.

Прышоў Кундзюкоў, зьдзівіўся, што Тайдана арыштавалі, лаяў чырвоных, а калі адыходзіў, дык сказаў, што ў Багародзкім трэці дзень ідзе бой, з гораду два параходы з кулямётамі прыйшлі, б'юць народ, каго папала.

На трэці дзень Міколка з Сымонкай адпрасіліся ў загадчыка ў горад—наведаць Тайдана.

Стэпа з дзяўчатамі напяклі пірагоў, насмажылі рыбы і далі хлопцам занесьці поўны кошык яды.

Міколка з Сымонкаю перш за ўсё пайшлі ў турму, дзе служыў Міколкаў дзядзька.

Каля турмы народу ўсякага шмат, усе з клункамі, з кошычкамі.

— Чаму гэта народу столькі?—запытаў Сымонка адну старую.

— Перадача сёньня, вось і народ...

Падыйшлі да дзьвярэй—вартавыя.

— Вам каго?—пытаюць.

— Дзядзька мой тут служыць, наглядчык. Карнеяў Іван яго завуць,—адказаў Міколка.

— Калі служыў?

— Заўсёды служыў, даўно... шмат год.

— Ну, дык, брат, ніякага тут Карнеява няма, цяпер тут усе новыя—чырвонаармейцы.

— А сюды старога ды маладога тры дні назад ня прыводзілі?—асьмеліўся запытаць Сымонка.

— Тут штодзень і старых, і маладых колькі хочаш водзяць—дзе іх запомніш. Ідзеце вось у тыя дзьверы да дзяжурнага, паглядзеце па кніжцы.

Хлопцы ўвайшлі да дзяжурнага, каля якога стаяла чарга: усе даведваліся пра сваіх.

— Вам каго?—спытаў дзяжурны? Калі чарга дайшла да іх.

— Тайданам завуць аднаго, а другі Сямёнаў Ільля.

— Тайданаў, Міхал Тодараў?

— Але, але!—абрадваліся хлопцы.

— Тут. Камэра № 5. Перадача ці што?—Давайце. Другі, кажаце, Сямёнаў Ільля?—зноў запытаў дзяжурны, праглядаючы альфабэт арыштаваных.—Няма такога,—двойчы праглядзеў. Можа ў другой турме.

— Хіба яшчэ турмы ёсьць?—зьдзівіўся Сымонка.

— Ого!—усьміхнуўся дзяжурны.—Цэлых тры... Усё для нашага брата стараліся, ды цяпер, відаць, і самім згадзіліся.

Сымонка не разумеў, пра каго гэта казаў дзяжурны...

— Запіскі ня будзе?—Спытаў дзяжурны.—Што, алоўка няма? Вось аловак, вось і паперка.

Дзяжурны адарваў кавалачак, дзе Міколка і напісаў:

«Мы, Міколка і Сымонка, прынесьлі табе пірагоў. Напішы, ці хутка выйдзеш».

Чырвонаармеец панёс кошык разам з іншымі, і праз гадзіну вынес некалькі пустых. Тут быў і Міколкавы кошык.

— Хто Тайдану прыносіў?

— Мы!

— Бярэце, дзякуй сказаў стары.

— А ліста няма?—запытаўся Міколка.

— Лісты перадаваць ад зьняволеных без дазволу ня можна,—сказаў чырвонаармеец і зноў пайшоў з перадачаю.

Міколка ўспомніў, што дзяжурны сказаў: «Камэра № 5».

— Няўжо Тайдан там, у «пятай?» Закуты ў склепе?

Міколка сказаў пра гэта Сымонку. Той успомніў Міколкава апавяданьне пра дзядзьку і арыштанта, захацеў напэўна даведацца і зноў пайшоў да дзяжурнага.

— Табе што яшчэ,—заўважыў яго дзяжурны.

— А Тайдан у склепе сядзіць, закуты?—спытаў Сымонка.

— Нічога ня ведаю, хлопец, не перашкаджай, бачыш. чарга якая чакае,—спакойна адказаў яму дзяжурны.

Хлопцы выйшлі на вуліцу.

## XIX

## НЕЧАКАНАЕ СПАТКАНЬНЕ

На вуліцы, каля турмы стаяла некалькі асядланых коняй, іх трымалі чырвонаармейцы.

Сымонка ніводнага добрага каня ня міне, каб не паглядзець бліжэй, а то і пахлопаць рукою па грудзёх, па баках пагладзіць.

У аднаго чырвонаармейца быў вараны і кары, у другога—шэры і вараны.

— Вось гэта коні!—крыкнуў Сымонка,—вось і Чалдан быў такім,—паказаў ён на шэрага каня.

— А можа гэта Чалдан і ёсьць,—сказаў Міколка.

Падыйшлі бліжка.

— Што вам трэба?..—злосна запытаў чырвонаармеец.

— Добры конь,—паглядзець ахвота!

— Глядзі, Міколка, гэта-ж Чалдан!—увесь усхваляваны, сказаў Сымонка,—вось і ноздры ружовыя, і на грудзёх чорная грыўня...

— Брэшаш?—не паверыў Міколка.

— Дальбог, ён! Я тады-ж добра запомніў. Вось каб даведацца—кульгае ён ці не?

— Гэта ў вас папсаваны?—запытаў Сымонка ў чырвонаармейца.

— Сам ты ці не сапсаваўся? Шмат ведаеш надта,—пакрыўдзіўся чырвонаармеец. Вось, патрымай хто-небудзь,—сказаў ён ужо больш лагодна,—я пайду прыкуру.

Сымонка падбег, узяў павады, пахлопаў каня па грудзёх.

— Ён! Каб я так памёр—ён! Вось і грыўня,—паказаў Сымонка на чорную круглую плямку.

— Чалдан,—сказаў ён голасна.

Конь паварушыў вушамі, зірнуў на Сымонку, Міколку...

— Ён і ёсьць!—узрадаваўся Сымонка.

— Чый гэта конь?—запытаў ён чырвонаармейца, які падыйшоў да іх.

— Камісара вайсковага,—адказаў чырвонаармеец,—ды вось ён і сам ідзе.

З дзьвярэй турэмнай канторы выйшаў высокі чорны чалавек у вайсковай форме, на рукаве чырвоная зорка і некалькі чырвоных квадратаў, ля пояса—рэвольвэр.

«Ён і ня ён—думаў Сымонка.—Як-бы запытаць?»

— Міколка, давай запытаемся, ці ня той чорны...

Вайсковы падышоў да каня, пагладзіў па шыі.

— Ну, Чалдан, зараз паедзем,—сказаў ён каню.—Таварыш Лапцёў, патрымай яшчэ, я вярнуся ў кантору.

Цяпер Міколка з Сымонкам былі цьвёрда ўпэўнены ў тым, што гэта ні хто іншы, як той самы чорны, які жыў зімою ў манастырскай хатцы.

— Як завуць гэтага камісара?—запытаў Міколка чырвонаармейца.

— Навошта табе?

— Мы яго знаем, толькі забыліся, як завуць,—схітраваў Міколка.

— Гэта таварыш Іваноў. Як вы яго ведаеце?—зацікавіўся чырвонаармеец.

— Раней бачылі—у вёсцы ён жыў, недалёка ад нас.

— А-а, усё можа быць.

— Ну, едзем,—прагучэў голас чорнага.

— Не пазнаеш, таварыш Іваноў, хлопцаў. Яны цябе знаюць.

— Якія хлопцы?—запытаў чорны.

— Ды вось гэтыя.

— Дзе вы мяне бачылі? Даўно?—зьвярнуўся чорны да хлопцаў.

— Гэтай зімою ў хатцы, у лесе,—сказаў Міколка.

— Го! Дык вось вы хто! Як-жа, памятаю, памятаю! Ну, здаровы, як жывеце?—моцна ціснуў рукі чорны.—Як-жа вы пазналі?

— Вось Чалдана перш спазналі, а потым і вас,—сказаў Сымонка.

— Ну, вось што, дарагія таварышы, зараз я сьпяшаюся ў штаб па важнай справе, а вы заходзьце да мяне гадзіны праз дзьве; я жыву на Вялікай Каралеўскай, на самым беразе, дом на рагу,—не забудзеце? Абавязкова заходзьце!

— Знойдзем!—упэўнена сказаў Міколка—я гэту вуліцу ведаю.

Камісар сеў на каня і наўскач паехаў у горад.

— Ня кульгае Чалдан, паправіўся,—заўважыў Сымонка, глядзячы яму ўсьлед, і хлопцы паволі пайшлі па шашы ў горад.

— Вось добра!—радаваліся хлопцы. І Тайдана, і Чалдана, і чорнага—усіх адшукалі! Толькі салдата яшчэ знайсьці ды з турмы іх з Тайданам вызваліць!

Праз дзьве гадзіны хлопцы ўжо былі на Вялікай Каралеўскай. Зайшлі на двор. Чалдан стаяў прывязаны ля ганку.

Пачалі ўзыходзіць на сходкі, а таварыш Іваноў ужо крычыць.

— Сюды, сюды, таварышы! Ну вось, будзем гарбату піць,—саджаў ён хлапцоў.—Раскажэце мне, што вы тады падумалі пра мяне, калі не знайшлі ні мяне, ні Чалдана.

Хлопцы засароміліся і маўчалі, асабліва Сымонка: яму сорамна было глядзець на таварыша Іванова.

— Ведаю, ведаю: падумалі, што валацуга і ёсьць, ды яшчэ і злодзей—правільна?

Сымонка, ня ўзьнімаючы вачэй, кіўнуў галавою.

— Ну, добра, што было, тое прайшло, цяпер мы пазналі адзін аднаго. Ведаеце, хлопцы, Чалдан добра паслужыў мне ў тую ноч, ды ня толькі мне, але і нашаму атраду... Ён не такі ўжо псованы: спачатку, сапраўды, кульгаў, а потым—разышоўся, хоць-бы што! Я ў тую ноч кілёмэтраў пяцьдзесят на ім праімчаў, вялікую справу зрабіў... Ды чаму-ж вы не ясьцё і ня п'еце? Ежце як трэба,—частаваў Іваноў.

— У нас Тайдана арыштавалі і яшчэ аднаго, салдата нашага...

— Якога Тайдана? Ці не стары такі маленькі? Я сёньня такога дапытваў у турме.

— Але, але, ён і ёсьць!—і хлопцы расказалі пра ўсё: і пра вобыск, пра шаблю і пра салдата.

Камісар слухаў уважліва.

— Ведаю і салдата, разам з Тайданам прывезьлі, толькі Тайдана ў агульную камэру пасадзілі, у № 5, а таго асобна, у адзіночную.

— Пятая камэра—у склепе, куды закутых саджаюць?—запытаў Міколка.

— Не!.. Скуль ты выдумаў? Гэта вялікая, сьветлая, на другім паверсе. Там у кайданах нікога няма. Пра Тайдана вы не клапацецеся, мы яго вызвалім дні праз два, а можа і раней, а вось з белым салдатам, з тым цяжэй. Лічаць, што ён мае дачыненьне да багародзкага бунту... Але як вы расказваеце, дык выходзіць, што ён не вінаваты. Можа і яго хутка вызвалім. Чакайце. Вось як мы зробім: вы зараз паедзеце дамоў, а вашу размову я перадам сьледчаму... Калі ён захоча сам вас паслухаць, я за вамі пашлю пасланца, а калі ня будзе трэба, дык чакайце да хаты Тайдана і салдата.

Хлопцы ўзрадаваліся.

— Ну, а Чалдана вам трэба?—запытаўся сьмяючыся таварыш Іваноў.

— Не, хай у вас будзе,—сказаў Сымонка, толькі, калі вы будзеце адступаць, не забівайце яго, аддайце нам...

— Ха-ха-ха!—засьмяяўся Іваноў.—Сябры вы мае дарагія, мы адступаць ня будзем! А каня я вам другога дастану, каб ён у вас і араў, і ваду вазіў, і ў горад езьдзіў,—добра?

— Добра,—згадзіліся хлопцы,—для нас яшчэ і лепшы такі!

Пачалі зьбірацца да хаты.

— Да нас прыяжджайце, калі-небудзь, таварыш Іваноў,—запрашалі хлопцы.

— Абавязкова, як толькі трапіцца дзень,—абавязкова. Вы таксама, як будзеце ў горадзе, дык да мяне. І загадчыку скажаце,—хай заходзіць. Ну, бывайце... Я вельмі рады, што вас спаткаў.

— І мы рады! Бывайце! Чакаем вас! Хутчэй прыяжджайце!—весела разьвіталіся хлопцы і пайшлі на прыстань.

Праз дзьве гадзіны хлопцы былі ўжо дома, дзе іх стрэлі пытаньнямі: як салдат, Тайдан, ці бачылі іх, ці хутка яны вернуцца?

Хлопцы падрабязна расказалі пра спатканьне з таварышам Івановым і пра яго абяцаньне вызваліць хутка і Тайдана, і салдата...

— Ну і малайцы!—хваліў загадчык Міколку і Сымонку.— І бываюць-жа ў жыцьці такія шчасьлівыя выпадкі!

Мінуў дзень, другі, няма ні Тайдана, ні салдата. Усе пачалі пасылаць Міколку з Сымонкай у горад даведацца ў таварыша Іванова пра Тайдана.

Увечары зыйшліся ў вялікім пакоі, расчынілі ўсе вокны. Надвор'е было ціхае, цёплае.

Загадчык сказаў, што ў наступную нядзелю ўсе паедуць у горад—сьвяткаваць першае мая і ўдзельнічаць у маніфэстацыі. Пасьля-ж сьвята трэба ўзяцца за працу.

— Так, хлопцы, ледзь не забыўся, сказаў загадчык—наш аддзел хоча, каб мы зрабілі дзьвесьце маленькіх кошычкаў: іншыя дзіцячыя дамы, дзе ёсьць майстэрні, таксама зробяць, і першага мая ўсім дзецям з дзіцячых дамоў і вучням раздадуць кошычкі з падарункамі. Як вы думаеце—пасьпеем зрабіць?

— Пасьпеем, пасьпеем!—закрычалі ўсе.

Праз вакно пачуўся нейкі крык, нібы з таго боку рэчкі.

— Ціхайце, хлопцы, здаецца, крычаць?

Сьціхлі прыслухаліся.

— Лодку!—ледзь чутно даносілася з-за рэчкі.

Усе ўзварушыліся.

— Хто-б гэта мог быць так позна?

— Лодку! Лодку!—чулася з таго боку.

— Паедзем, хлопцы,—прапанаваў Гошка, зірнуўшы на таварышоў.

— У такую ваду ноччу небясьпечна,—сказаў загадчык.

— Робінзон па моры на бервяне плаваў, ды і то нічога, а ў нас лодка,—заўважыў мімаходам Сымонка.

— Лодку-у!—усё больш упарта крычаў нехта з-за рэчкі.

— Ну, што-ж, хлопцы, паедзем? Дакажам Сымонку, што і мы можам быць Робінзонамі,—засьмяяўся загадчык,—хто са мною?

Усім хацелася паехаць і шмат рук узьнялося ўгару.

Абралі самых моцных: Міхалку і Яцуру. Рэшта павінны будуць на беразе запаліць агонь, каб відаць было, куды плысьці.

Спусьцілі лодку. Міхалка і Яцура селі веславаць, а загадчык—кіраваць.

Адплылі ад берагу, і цёмная імгла паглынула іх, толькі было чутно, як скрыпелі вёслы, плёхалі па вадзе.

Гукі ўсё цішэй і ўрэшце зусім змоўклі.

— Ці не ўтапіліся? Нешта ня чутно,—сказаў Гошка. Прыслухаліся... Пачулі стук вясла аб лодку.

— Пераехалі... Гэта вёслы на борт паклалі, па вадзе добра аддаецца,—павесялелі дзеці.

Распалілі агонь. Агонь запалаў. Пачалі слухаць—зноў заплёхалі вёслы.

— Вяртаюцца!.. Чакайце, ня шумеце!—спыніў хлопцаў Гошка.

Галасы нібы бліжэй, а яшчэ ня відаць.

— О-го!—прагучэў вясёлы голас загадчыка.

— О-го!—голасна адказалі хлопцы.

— Болей агню, каб сьвятлей было,—ужо зусім блізка гаварыў загадчык.

Падкінулі сухога гальля. Агонь высокім слупам узьняўся ўгару, асьвятляючы круты бераг і граючы ў шпаркіх хвалях.

— Ёсьць!—пачулася ля самага берагу, і лодка ўрэзалася ў пяшчаны бераг.

— Селянін нейкі. Мусіць, нехта з вясковых,—сказаў Сымонка, разглядаючы тых, хто прыехаў.

Унізе выцягнулі з вады лодку, перавярнулі яе і пачалі ўзьнімацца па адхону да агню.

— Хто?—спыталі хлопцы Яцуру і Міхалку, якія вылезьлі першыя.

— Ня ведаем,—нейкі дзед.

— Ох, бадай вас, ды вы ўсе тут сабраліся,—пачуўся знаёмы голас з-за загадчыкавай сьпіны.

— Тайдан! Тайдан!—і голасныя радасныя крыкі хлапцоў панесьліся ў начную цемру.

## XX

## ЗАБАСТОЎШЧЫКІ

Загадчыка выклікалі ў горад дапамагаць ладзіць першамайскую дзіцячую маніфэстацыю. Тайдан адпачываў ад пяражытых хваляваньняў. Шандор атрымаў з гораду ад землякоў ліст, што іх хутка накіруюць у Вэнгрыю, бо бальшавікі згадзіліся памяняцца палоннымі,—хадзіў вясёлы і нават, на дзіва хлопцам, мармытаў нейкую песьню.

Хлопцы адчувалі сябе вольна і настолькі асьмялелі, што кінулі слухацца Міхалкі. Гэта Міхалку дужа не падабалася. Ён прывык, каб яго ўсе баяліся, а тут, калі прыехаў новы загадчык, улада яго над хлопцамі пачала зьнікаць з кожным днём. Ды і загадчык яго ня вылучыў сярод іншых.

«Ну, пачакайце, я яшчэ пакажу вам,—будзеце ведаць»,— думаў Міхалка.

Другі дзень хлопцы рыхтавалі кошыкі.

— Ну, што, не казаў я!—казаў Міхалка.—Адзін чорт! Раней сядзелі і цяпер будзем дзень-у-дзень за кошыкамі сядзець!

— Ды гэта-ж мы на сьвята, ня мы адны, прытулкавым-жа,— супярэчыў Рыгор.

— Каму трэба, той хай і робіць, а я ня буду для іншых працаваць. Што мне цяпер за гэта могуць зрабіць? Мы вольны,— што захочам, тое і зробім. Ха! Я лепш на рэчку пайду.

Сонца, нібы разам з Міхалкаю, сьмяялася ў расчыненае вакно, грала на сьценах, на столі, гэтак і вабіла на вуліцу.

— І я ня буду,—упарта абвясьціў Васіль,—я ўсё роўна за белых.

— Чаму-ж ты з белымі не ўцякаў?—пакпіў з яго Сымонка.

— І ўцяку! Думаеш, не ўцяку? А замест дзяўчат падлогі мыць ня буду.

— Ты не за дзяўчат мыеш, а за сябе, у сваёй-жа спальні,— правільна даводзіў Жыхарка.—Што-ж, за цябе загадчык, ці што, мыць будзе?

— Хай мые, мне якая справа!

За Васілём адмовіліся працаваць Яцура, а потым і Рыгор.

— Што мне больш за ўсіх трэба ці што?—сказаў ён і прылучыўся да забастоўшчыкаў.

— Кідай, Жыхарка! а калі не—дык вось!—і Міхалка паказаў кулак.

Гошка з Міколкаю сьпяшаліся скончыць заданьне, яны наогул былі супроць забастоўкі.

Прышоў майстар зьдзівіўся, чаму хлопцы не працуюць.

— Хопіць! Напрацаваліся. Працуй сам, калі хочаш,—патрубіянску, адказаў Міхалка.—У нас цяпер воля—што хочам, тое і робім.

Майстар паківаў галавою, нічога не сказаў.

— Мы—забастоўшчыкі,—выхваляўся перад дзяўчатамі Міхалка,—захочам—будзем працаваць, не захочам—ня будзем.

У гэты дзень у Міхалкі сьвярбелі рукі, ён чапляў дзяўчат, а Міхалкаў падагалосак, Васіль, забег у дзявочую спальню, перавярнуў усе ложкі, паламаў зробленыя на вокнах лялькавыя хаткі, а лялькам паадрываў галовы.

За два дні да сьвята прыехаў загадчык з гораду. Увечары, калі зыйшліся ў вялікім пакоі, загадчык сказаў, што пасьля заўтра ўсе едуць на параходзе ў горад, каб першага мая з раньня быць на сьвяце.

— А хлопцы кошыкаў не рабілі,—здрадзіла Манька.

— Як не рабілі? Чаму?

— Яны—забастоўшчыкі... лялькі нашы паламалі.

— Забастоўшчыкі?—усьміхнуўся загадчык.—Ну, што-ж, будзем весьці перагаворы. Эй, забастоўшчыкі! Абірайце дэлегатаў ды пасылайце да мяне для перагавораў,—жартаваў ён.

— Ды што-ж, Іван Мікалаевіч,—выступіў Яцура,—вось ужо пяты год я тут і ўсё кошыкі ды кошыкі—з раніцы да ночы... абрыдла.

— Вядома абрыдла, не глядзеў-бы на іх—падтрымалі іншыя.

— Дык у вас сапраўды забастоўка?—зьдзівіўся загадчык і кінуў жарты.

— Абрыдла, кажаце?

— Проста апрыкрыла,—хорам адказалі хлопцы.

— Ну, што-ж, улетку можна будзе і ня плесьці кошыкаў, адпачыць ад гэтай працы: іншай працы досыць. Будзем так рабіць, каб ніякая справа не рабілася прыкрай.

Хлопцы ўпяршыню пасьля прыезду загадчыка пачулі нейкі сорам перад ім.

Толькі Міхалка хадзіў героем: што захоча—тое і будзе!

## XXI

## НЯХАЙ ЖЫВЕ ПЕРШАЕ МАЯ!

Перад гэтым у дзіцячым доме адбываліся вялікія клопаты: Тайдан як мага хутчэй папраўляў боты, мазаў іх дзёгцем, ваксаваў. Дзяўчаты прасавалі сабе сукенкі, хлопцам кашулі.

Малыя румзалі, што іх не бяруць.

У чатыры гадзіны параход «Рэспубліка Саветаў» стаяў ля берагу і праразьліва сьвістаў.

З чырвоным сьцягам, вясёлыя накіраваліся дзеці ў горад. Упяршыню на сваім жыцьці яны гэтак урачыста ехалі на сьвята.

Ля гарадзкой прыстані ішла сьпешная праца: мылі параходы, прыбіралі іх, упрыгожвалі зялянінаю і рознакалёрнымі сьцягамі.

У горадзе падмяталі плошчы, вуліцы. Увечары ўвесь горад упрыгожыўся чырвонымі сьцягамі.

Рыхтавалася нешта важнае і вясёлае.

Раніцою, ледзь сьвет, дзеці ўжо былі на нагах.

Дзень быў ясны, сонечны. Сьвяточна ўбраны натоўп сьпяшаўся ў цэнтр гораду. Ля «Палацу Працы» роўнымі радамі квітнелі вучні і дзеці з дзіцячых дамоў: за імі стаялі арганізацыі са сваімі сьцягамі. Усе чакалі сыгналу, каб вырушыць.

Заіграла музыка, закалыхаліся сьцягі і працэсія рушылася наперад.

Мора галоў і чырвоных сьцягаў дапоўніла ўсю вялікую вуліцу. У вушах стаяў шум ад музыкі, сьпеваў. У грудзі плыло нейкае новае радаснае пачуцьцё, бадзёрасьць...

— Ніколі яшчэ так ня было,—казалі хлопцы ў радох.

Выстраіліся на плошчы Рэвалюцыі.

З высокіх пляцовак казалі прамовы, віталі са сьвятам, і ўсе тысячы людзей крычалі «ура».

Міма прамоўцаў стройна, колёнамі праходзілі рабочыя, вучні, чырвонаармейцы.

Прагучэла нейкая каманда, і некалькі колёнаў рушылася ў бакавую вуліцу, што ішла на ваколіцу гораду.

— Куды гэта?—дзівіліся, ідучы, хлопцы.

— Навошта гэта нас з плошчы павялі?

Спыніліся ля вялікага панурага будынку: турма.

Адчынілася ўнутраная турэмная брама. Зайграла оркестра, і вялікі натоўп сялян вышаў з турэмнага двара на пляц перад турмою.

— Багародзкія бунтары,—прабег шопат па радох і сярод вакольнага натоўпу.

Нейкія старыя бабулькі бедавалі.

— Што-ж гэта з імі рабіць будуць? Няўжо расстрэльваць?

Сяляне, павесіўшы галовы, пакорна чакалі свайго кону. Да іх за драцяную сьценку ўвайшлі некалькі рабочых і чырвонаармейцаў.

У хлопцаў вясёлы сьвяточны настрой зьмяніўся на нейкае трывожнае чаканьне.

«Што-ж гэта будзе?»

— Таварышы сяляне!—голасна пачаў гаварыць адзін рабочы з чырвонаю істужкаю на рукаве,—што мы вам зрабілі кепскага, што пайшлі супроць нас?

Сяляне маўчалі.

— Хіба не аднэй працай мы з вамі жывем, хіба не для вас мы куем плугі, бароны, косы, тапары? Нам адзін без аднаго ніяк нельга быць! Ці думалі вы калі-небудзь пра гэта?

— Ці-ж мы супроць вас?—сказаў рыжы селянін з краю.— Мы супроць тых, хто ўсё хацеў забраць у нас, супроць чырвоных.

— Таварышы-сяляне, вас абдурылі розныя валацугі! Чырвоныя гэта тыя, хто ўзьняў чырвоны сьцяг паўстаньня супроць кулакоў-міраедаў, гэта мы і ёсьць—рабочыя! У Чырвонай

арміі—вашы сыны і нашы сыны і браты,—ці-ж ворагі яны вам? Глядзеце, трава вылазіць з зямлі, зямля чакае сваіх аратых, ваша месца там, на полі, за плугамі!..

— Ды мы былі-б рады, самі ведаем, ды бачыш справа якая выйшла,—адказаў селянін з маленькай сіваю барадкаю.

— Савецкая ўлада ведае, што ня злосьць вас штурхала на бунт, а цемра ваша. Ці правільна?

— Вядома, цемра... Несьвядомыя мы...—загаварылі разам сяляне, пасьля пасьмялеўшы і ўзьнімаючы галовы.

— Сёньня—наш дзень,—казаў далей рабочы,—наша сьвята. Ува ўсім сьвеце рабочыя сьвяткуюць гэты дзень. У гэты дзень рабочая ўлада даруе вам вашы памылкі. Далучайцеся да нас, як вольныя грамадзяне, як вольныя браты! Пакажэце, што вы ня ворагі сабе, ня ворагі рабочым!

— Даруй, таварыш, нам, дурням,—пакланіўся рыжы селянін.

— Даруй!—паўтарылі за ім іншыя.

— Ня я, а ўлада рабочых вам даруе! Памятайце, таварышы-сяляне: нам адзін без аднаго нельга, сяляне і рабочыя павінны быць, як адзін, разам! Няхай жыве злучанасьць рабочых і сялян! Ура!

— Ура!—грымнуў натоўп.

Оркестра зайграла «Інтэрнацыянал», і сяляне перамяшаўшыся з рабочымі і чырвонаармейцамі, рушыліся назад на плошчу.

— Вось гэта хвацка?—радасна загаварыў Сымонка.—Вось радуюцца, пэўна, сяляне!

Хлопцы павесялелі.

— Го, ды і нашы тут,—пачулі хлопцы ззаду знаёмы голас.

Азірнуліся—салдат Ільля!

— Ты адкуль? Дзе ты быў? Цябе выпусьцілі?—закідалі салдата пытаньнямі ўзрадаваныя дзеці.

— Выпусьцілі цяпер вось, разам з нашымі сялянамі. Вось і дзядзька мой ідзе, што размаўляў з рабочымі.

— Ты да нас паедзеш цяпер? Тайдан даўно дома.

— Не, хлопцы, зараз я ў нашу вёску. Дзякуй вам за ўсё! Прыяжджайце да нас у Багародзкае, на параходзе гэта хутка даедзеце. Абавязкова ўлетку прыяжджайце!

Салдат, разьвітаўшыся з хлопцамі, далучыўся да сялян.

Хлопцам зрабілася зусім весела: Гошка, які вельмі расчуліўся адвярнуўшыся, выціраў сьлёзы.

Прышлі зноў на плошчу, там старшыня Губвыканкому гаварыў сялянам зноў прамову, і канчаючы яе, крыкнуў:

— Няхай жыве ўлада рабочых і сялян! Ура!

— Ура!—падхапілі тысячы галасоў, і гулка грымнула музыка.

Калі ўсё змоўкла, нейкі вайсковы з высокай трыбуны абвясьціў:

— А пятай гадзіне дзеці арганізаваным парадкам накіроўваюцца на прыстань Савецкага флёту і садзяцца на параходы «Першае Мая» і «Рэспубліка Саветаў». Пагулянка будзе ўніз па рацэ і назад. Багародзкія сяляне ідуць палуднаваць у «Дом селяніна», а потым на параходзе «Чырвоны Кастрычнік» едуць дамоў. Параход адыходзіць роўна а пятай гадзіне.

Махнуў рукою і оркестра зайграла марш.

Увечары яркая чырвоная зорка, прыладжаная на высокім шпілі «Палацу працы», як маяк, далёка сьвяціла ў цемру ночы ці мітусячыся адбівалася ў шпаркіх хвалях рэчкі.

А позна ноччу вясёлы сьмех і гоман дзяцей, якія вярнуліся з катаньня, загучэлі на вуліцах і завулках ціхага гораду.

Цэлых тры дні хлопцы прабылі ў горадзе. Былі і ў іншых дзіцячых дамох, пазнаёміліся там з дзецьмі, запрашалі іх да сябе на лета—па грыбы, па ягады.

Усёй хэўраю хадзілі да таварыша Іванова, пілі ў яго гарбату, езьдзілі па двару на Чалдане, а ўвечары на аўтомобілі, езьдзілі ў чырвонаармейскі клюб, дзе карысталіся вялікаю ўвагай.

Так было весела і цікава, што не хацелася ехаць з гораду. Але сьвята скончылася і ўсюды ўзяліся за працу.

На трэці дзень увечары маленькі паштовы катэр памчаў іх назад, і праз дзьве гадзіны іх спаткалі дома ўзрадаваныя малыя.

## XXII

## НОВАЯ ЎЛАДА

Надыйшла рабочая пара. Усюды ішла арганізацыя новае ўлады на мясцох.

У дзіцячым доме быў вызначаны другі агульны сход, каб абраць камітэт для правядзеньня летняе працы.

Пасьля гарачае прадвыбарнае агітацыі за старшыню аднагалосна абралі Тайдана, за першага яго памоцніка—Андрэйку, за другога—Зоську, за сакратара—Гошку. Міхалка быў забаляціраваны нават сваімі прыхільнікамі, не гаворачы ўжо пра іншых.

Ухвалілі ўзяцца за працу на гародзе на другі дзень.

Раніцою майстра Шандор, які атрымаў з гораду запіску, няпрытомны ад радасьці, стараўся нешта растлумачыць загадчыку незразумелаю моваю. Можна было зразумець адно: палонныя едуць дамоў, у Вэнгрыю.

Прышоў другі палонны, які добра гаварыў па-руску, і пераклаў, што сёньня з гораду адпраўляюць эшалён палонных на радзіму,—Шандор павінен ехаць.

— Што-ж, шчасьлівай дарогі!—сказаў загадчык і загадаў, каб яму далі на дарогу, што можна.

Усе хлопцы прынялі жывы ўдзел ў выпраўцы майстра ў дарогу, благога ніхто не памятаў, старое забылася, а пры новым загадчыку Шандор працаваў таксама, як і хлопцы, і пакінуў свае даўнейшыя звычкі.

Міколка на разьвітаньні ціснуў яму руку, сьмяяўся і казаў:

— Пішы, Шандор, як там у Вэнгрыі справы.

— Ліст? Добра, Міколко... Ня злуй... ня злуй...—зьвярнуўся ён да дзяцей, а ў самога вочы наплылі сьлязьмі.

— Гошко, бывай, Янко!—з усімі разьвітваўся Шандор.

Усе пайшлі праводзіць яго да манастырскага мосту, доўга з узгорку махалі яму шапкамі, хусткамі, пакуль Шандор ня зьнік на павароце за лесам.

— Ох, відаць, і рады Шандор!—казаў вяртаючыся назад Міколка.—Дома яго не чакаюць—думаюць, што ён ужо пра-

паў, а ён і заходзіць, нібы падарожны,—начаваць прасіцца... Добра!

— А як ня пусьцяць начаваць? Могуць ня пусьціць,—разважаў Гошка.

— Ну, ён тады і скажа, хто ён... Ах, як-бы я, хацеў куды небудзь так вярнуцца раптам!—марыў Міколка.

Пасьля абеду ўсе выйшлі на гарод капаць грады.

Хлопцы дружна ўзяліся за працу—камітэт ухваліў! Толькі Міхалка Козыр, каб дапячы камітэтчыкам, захацеў сарваць працу: ня будзе ён слухацца камітэту, ды і ўсё! Што яму могуць зрабіць.

Загадчык быў у пуні, накладваў гной на насілкі. Міхалка з Ваською прынесьлі адны насілкі ды і ўцяклі на рэчку. За імі—Рыгор з Яцураю, а потым—і рэшта дзяцей.

Чакаў, чакаў загадчык з насілкамі, не дачакаўся, выйшаў на гарод паглядзець, а там толькі камітэтчыкі: Андрэйка, Зоська ды Гошка.

— Дзе-ж іншыя?—зьдзівіўся загадчык.

— Міхалка на рэчку зьвёў, ня слухаюцца нас...

— Можа стаміліся,—сказаў загадчык.—Пойдзем і мы купацца, пасьля даробім.

— Загадчык ідзе!—крыкнула Манька-Варона, заўважыўшы загадчыка, а сама схавалася за вадамерную будку.

Хлопцы пакідаліся ў ваду, хто нырнуў, хто імкнуўся адплысьці на сярэдзіну ракі, каб ня трапіць на вочы загадчыку: усе думалі, што ён будзе лаяць.

— Далёка ня плывеце,—крыкнуў з берагу загадчык,—параход ідзе!

Сапраўды, з Юштынскае пратокі поўным ходам ішоў вялікі пасажырскі параход.

— Хутчэй да берагу! Захлісьнуць можа!—крычаў загадчык і, шпарка распрануўшыся, кінуўся ў ваду і паплыў ратаваць.

Параход быў ужо зусім блізка, вялікія хвалі з шумам набліжаліся да хлапцоў, якія купаліся, а крыху вышэй шалёна налятаючы на бераг, разьбіваліся ў пырскі.

Параход даў доўгі сьвісток: ён ужо далёка пакінуў за сабою Ваську і Міхалку, якія змагаліся і былі якраз сярод рэчкі.

Хвалі то падкідвалі іх, то падалі ўніз.

— Лодку хутчэй!—крыкнуў загадчык на бераг, а сам праз хвалі шпарка паплыў да Ваські і Міхалкі.

— Трымайся на вадзе—выплывем!—падбадзёрваў ён іх.

Васька ўжо ня чуў апошніх слоў, бо набегшая хваля, як шапкаю, накрыла яго, і ён больш не паказваўся на паверхні вады.

Загадчык шпарка даплыў да таго месца, дзе затануў Васька, і таксама зьнік пад вадою.

Да места няшчасьця Міколка з Гошкаю што было сілы гналі лодку, убачыўшы якую Міхалка падбадзёрыўся і лёг на сьпіну, каб лягчэй было трымацца на вадзе.

Узяўшы Міхалку, хлопцы пакінулі веславаць. Яны чакалі ці ня зьявіцца над вадою загадчык.

Лодку нясла плынь. Хлопцам здавалася, што прайшло многа часу, як загадчык зьнік пад вадою, і што ён таксама затануў, як Васька.

Вяртацца на бераг не хацелася.

Раптам недалёка ад лодкі ўсплёснула вада.

— Сюды! Хутчэй!—цяжка крыкнуў загадчык.

Міколка лоўкім ударам вясла павярнуў лодку носам, загадчык ухапіўся рукою за колца і глыбока ўздыхнуў.

— Хутчэй прымай,—пасьпешна прамовіў ён і выцягнуў з вады за руку Ваську.

— Да берагу! Хутка!—крыкнуў загадчык і ўскочыў у лодку.—Нічога, аджыве, нядоўга быў пад вадою!

Ён перавярнуў Ваську на бок, потым падняў за ногі і нешта пачаў рабіць з яго рукамі.

Міхалка, адчуваючы сябе вінаватым, сядзеў, павесіўшы галаву, і дрыжэў ад холаду.

Калі лодка ўрэзалася ў пясчаны бераг, Васька ачухаўся і замармытаў.

— Аджыў!—узрадаваліся хлопцы.

Дома загадчык нібы і не злаваўся, але і не жартаваў.

Васька зусім паздаравеў, але ўнікаў глядзець на загадчыка: нялоўка было.

На ўсіх надыйшло нейкае каяньне. Ніхто нічога не казаў, але гэта было відаць ва ўсім. І калі загадчык успомніў пра гарод, усе горача ўзяліся за працу, і да вячэрняе гарбаты выканалі ўсю работу.

Міхалка Козыр на гэты раз не пахваляваўся сваёй воляй, ён неяк прыціх і пасьмірэў.

Пасьля гэтай падзеі жыцьцё ў дзіцячым доме пайшло ўжо без такіх перабояў.

## XXIII

## ПОЛІТРУК

Пачалася касьба. Дзіцячаму дому аддалі манастырскія паплавы. Тайдан ладзіў, кляпаў косы. Стэпа з дзяжурнымі рыхтавала харчы, міскі, лыжкі.

Пастанавілі, каб усе ехалі на паплавы, да кургана. У доме заставаліся толькі Стэпа ды Сымонка,—за вартавога ў доме.

Дзень быў дзівосны—ясны, сонечны. Дзяўчаты і малыя вельмі радаваліся, бо раней іх нікуды ня бралі. Яны скакалі, крычалі, голасна выяўляючы сваю радасьць.

Загадчык з хлопцамі пайшлі наперад, а за імі Тайдан ехаў на Рыжку з малымі, з граблямі, з косамі і харчамі.

Лес зазьвінеў радаснымі звонкімі галасамі.

Атабарыліся. З посьцілак зрабілі дзьве палаткі, прыладзілі трыножак, на якім кашавары варылі абед і гатавалі гарбату. Тайдан увесь час падвостраваў косы, а хлопцы без кашуль доўгімі пракосамі ішлі за загадчыкам па шырокім лузе. Малыя бадзяліся па рэчцы. Дзяўчаты назьбіралі па місцы суніц і рыхтаваліся да абеду.

— Купацца!—крыкнуў загадчык і ўсе пабеглі на рэчку.

Доўга ня вылазілі з вады: кашавары ўжо двойчы прыбягалі: палудзень псуецца!

Просты палудзень—бульбяная каша з чорным хлебам—быў нязвычайна смачны. Усе елі з вялікім здавальненьнем. Гарбата з суніцамі—была яшчэ смачнейшая.

Касцы залезьлі ў палаткі адпачываць, іншыя разыйшліся, хто куды.

Загадчык з Тайданам ляжалі пад кустом і абмяркоўвалі гаспадарчыя пляны.

— О-го-го!—пачуўся з лесу голас.

Тайдан падняўся.

— Здаецца, Сымонка крычыць!

Сапраўды з лесу наўскач ехаў на чужым чорным кані Сымонка.

Загадчык устрывожыўся:

— Ці ня здарылася чаго?

Але ў Сымонкі быў радасны, вясёлы выгляд.

— Што гэта значыць?

Пад'ехаўшы бліжэй, ён весела крыкнуў:

— Таварыш Іваноў прыехаў! Зараз будзе тут, я наперад паехаў!

Сымонка саскочыў з каня і хлопаў яго па грудзёх.

— Гэта цяпер наш конь будзе, «Ліхтарыкам» клічуць,— радасна паведаміў ён.

З лесу выехала досыць чырвонаармейцаў, між іх і таварыш Іваноў.

— А мы вам на дапамогу!—сьмяяўся Іваноў, злазячы з каня.

Чырвонаармейцы прывязалі сваіх коняй у цяньку. Прывіталіся...

— Ну, што прымаеце нас?

— Вельмі рады! Чаму-ж ня прыняць!—сьмяяўся Тайдан.

— А касцы дзе вашы?—запытаў адзін з чырвонаармейцаў.

— Адпачываюць, стаміліся.

— А ну, таварыш, пакуль хлопцы сьпяць, пройдзем па пракосу,—прапанаваў Іваноў.

Чырвонаармейцы, гэтак-жа весела, як хлопцы раніцою, пайшлі даўгімі пракосамі праз увесь луг.

Хлопцы прачнуліся ад нейкага крыку, віску, гэта дзяўчаткі, якія прышлі з лесу, віталі таварыша Іванова.

Зьнік сон, усе выскачылі з палатак. Вось дык дзіва: на лузе звоняць косы, а палавіны лугу, як ня было!

Кашавары зноў згатавалі гарбаты і клікалі піць яе з сьвежымі ягадамі.

— Вось гэта сямейка!—радаваўся Тайдан.—Добра!

— Ну, дзеці, нас таксама да вашага дому прыпісалі,—сьмяючыся, казаў Іваноў.

— Як да нашага?—зьдзівіліся хлопцы.

— Так, я цяпер ваш палітрук. Што, незнаёмае слова? Гэта азначае, я буду вашым палітычным выхавальнікам. Буду расказваць вам пра чырвоных, пра белых, пра рабочых, пра сялян, хто там жыве і што на сьвеце дзеецца. Ну, ды размоў хопіць. А гэтыя таварышы—вашы шэфы: нібы як, апякуны. Калі, скажам, вам што не пад сілу зрабіць—яны зараз-жа вам дапамогуць. Зразумелі?

— Як-жа! Як-жа,—закрычалі хлопцы:—вось добра! Ура!

Доўга радасныя крыкі разносіліся па лесе.

— А гэта наш, «Ліхтар»,—урачыста абвясьціў хлопцам Сымонка.

— Як наш? Зусім? Назаўсёды?—і хлопцы абступілі каня. Гладзілі мацалі, хлопалі...

Рыгор ускочыў яму на сьпіну і наўскач паімчаўся па дарозе.

Усе па чарзе паспрабавалі паезьдзіць.

— Ды вы замучыце каня! Ён падумае, што трапіў у шалёны дом!—сказаў загадчык.

Пасьля гарбаты прайшліся яшчэ па два пракосы праз увесь луг і пачалі зьбірацца да хаты.

Агледзеліся, няма малых, Санькі і Цімкі.

Хлопцы лаялі дзяўчат, што тыя не глядзелі за малымі, а дзяўчаткі плакалі. Усе крычалі, шукалі ў рэчцы, нырцавалі ў глыбокія месцы,—няма!

— Куды маглі дзецца дзеці?

— Чырвонаармейцы на конях разьехаліся па лесе і праз паўгадзіны прыехалі назад ні з чым. Усе былі ўстрывожаны. Вясёласьць зьнікла.

Тайдан хадзіў па пракосах і зьбіраў раскіданыя мянташкі.

— Бач, жэўжыкі,—мармытаў ён, падыходзячы да кучы травы,—накідалі колькі: калі-ж яно высахне?

Нахіліўся, каб раскідаць траву, сунуў руку і адскочыў.

— Што гэта? Ці ня гадзіна пад руку трапіла?

Адкінуў нагою траву.

— Ах вы, піскуны няшчасныя! Вось і шукай іх! Знайшоў!— закрычаў Тайдан!—Вось яны!

Дзеці—і вялікія кінуліся да Тайдана.

Пад травою салодка спалі Санька і Цімка.

Усе лёгка ўздыхнулі.

## XXIV

## КОНТРРЭВОЛЮЦЫЯ

Пасьля касьбы загадчык паехаў на раённы настаўніцкі зьезд. Тайдан накіраваўся на пракосы адгароджваць сена.

Кіраўніцтва домам перайшло да камітэту.

Пасьля гарбаты Андрэйка разьмеркаваў работу на дзень.

Міхалка, Васька і Яцура, як чарговая тройка, павінны былі вазіць ваду на кухню ў пральлю і на гарод палівадь варыва.

Міхалка дэманстратыўна пачаў зьбірацца ісьці лавіць рыбу.

— Міхалка, а ваду?—спыніў яго Андрэйка.

— Вазі сам, на тое ты і камітэтчык,—засьмяяўся Міхалка і пайшоў.

— Яцура і, Васька—за вадою! удвох едзьце!

— Чаму-ж мы ўдвох? Міхалка пайшоў, а мы што?—протэставалі дзяржаўныя і таксама пабеглі на рэчку.

Стэпа лаялася, што такія вялікія хлопцы, а па ваду няма каму зьезьдзіць, хоць-бы дзяўчаты з вёдрамі зьбегалі.

— Як-жа! Пойдзем! Хлопцы будуць купацца ды рыбу лавіць, а мы за іх працуй... Не, няма дурняў!..

— Дык-жа абеду ня будзе, трэба-ж каму-небудзь схадзіць!— упарта стаяла Стэпа.

— Давай, сходзім!—згадзіліся Танька і Дарка, дзяжурныя па кухні, і пабеглі на рэчку.

— Мы прынясем, давайце вёдры!—крычаў Яцура з-пад берагу.

Васіль падц̱іскаўся ц̱іха да ӡяўчат і спіхнуў іх пад пясчаны адхон берагу. Ӡагрымелі вёдры, кумільгом пакац̱іліся ўніӡ ӡяўчаты. Яц̱ура падхапіў вёдры і ўц̱ёк да Міхалкі.

Дзяўчаты, плачучы, прышлі ні ӡ чым.

Абураная Ӡоська патрабавала ад Андрэйкі, каб той пакараў Яц̱уру ӡ Васькаю.

Андрэйка паслаў Гошку ӡа Яц̱ураю і Васькай, але тыя адмовіліся ісьц̱і, паграӡіўшы Гошку кулаком:

— Вось вашаму камітэту! Бач, камітэтчыкі сабраліся!.. Начальства!..

Гошка ўц̱ёк.

Раӡӡлаваўся Андрэйка, накіраваўся на бераг да Яц̱уры і Васіля і, ні слова не гаворачы, ударыў поўху аднаго, потым другога.

— Будӡец̱е ведац̱ь, як ня слухац̱ц̱а камітэту!

Міхалка ӡ Васілём і Яц̱ураю накінуліся на Андрэйку.

Пачалася бойка.

На гвалт прыбег Гошка і ӡяўчаты, ӡаступіліся ӡа Андрэйку.

Міхалка кінуўся на ӡяўчат, ударыў па твары Ӡоську, тая ӡагаласіла і пусьц̱ілася бегчы, а ӡа ёй усе іншыя... Андрэйка ӡ Гошкаю, бачучы, што ӡмагац̱ц̱а ім ня ў сілу, таксама пачалі ўц̱якац̱ь.

Васька і іншыя гналіся ӡа імі, пакуль тыя ня прыбеглі ў дом і не ӡамкнуліся ў спальні.

Ворагі стукалі ў ӡьверы, пагражалі выламац̱ь яе, і тады ўжо ім пападӡе як трэба.

— Усё роўна ня выпусьц̱ім! Есьц̱і ӡахочац̱ц̱а,—выйдӡец̱е!

— Памром, але ня выйдӡем!—крычала ӡ-ӡа ӡьвярэй Манька.

— Далоў камітэт!—крычаў Міхалка пад дружны сьмех прыхільнікаў,—к чорту новую ўладу!..

Стэпа, якая прышла ад суседкі, пачала лаяц̱ц̱а:

— Тфу ты, нячыстая сіла, і пліта патухла.

Пачала ӡноў распальвац̱ь пліту.

Прышлі іншыя хлопц̱ы ӡ пільні, таксама лаяліся, што так доўга не гатовы абед.

А на другім паверсе Васька падсоўваў пад дзьверы даўгую качаргу, каб падчапіць каго з нагу.

— Ня выйдзеце, дастану!—пагражаў ён тым, хто сядзеў за дзьвярамі.

Урэшце прышоў Тайдан, вызваліў палонных і пастанавіў паведаміць загадчыка: так трываць больш нельга!

Міхалка з Гошкаю і Яцураю ўцяклі на рэчку і толькі ўвечары, калі загадчык зыходзіў з параходу, прышлі дамоў.

На дварэ спаткалі таварыша Іванова, які заехаў, едучы з лягераў.

Хлопцы прывіталіся, але неяк вяла і холадна. Дзіўным здалося гэта загадчыку. Звычайна кожны прыезд яго ці каго-небудзь з добрых знаёмых спатыкаўся вясёлымі крыкамі.

І толькі пасьля Тайданавага дакладу ён усё добра зразумеў.

— Цэлая контррэволюцыя ў нас сягоньня адбылася,— сьмяючыся сказаў загадчык Іванову. Вы дужа трапна сёньня заехалі, пасьля вячэры трэба пагутарыць з імі.

Зыйшліся ў вялікім пакоі. Контррэволюцыянэры чулі сябе ня зусім добра.

— Слова даецца членам камітэту!—пачаў урачыста загадчык, калі ўсе пасядалі на лавы.

Зоська з завязаным вокам са сьлязьмі сказала, што яна больш ня будзе ў камітэце, што хлопцы зьдзекуюцца над ёю і навучаюць дзяўчат ня слухацца камітэту.

Андрэйка таксама адмовіўся.

— Лепш сам буду без чаргі ўсё рабіць, чымся гэтак,—сказаў ён і сеў.

Загадчык сказаў, што хлопцы яшчэ дрэнна разумеюць новы парадак, што калі яны самі каго абралі на якую-небудзь пасаду, дык абавязкова трэба яго слухацца, іначай ніколі ніякага парадку ня будзе.

— Слова даецца таварышу Іванову!

Іваноў устаў, нібы перад ім быў вялікі сапраўдны сход.

— Я параўноўваю дзьве падзеі ў маім жыцьці, зьвязаныя з вашым дзіцячым домам. Адно—ля кургану на касьбе, калі ўсе былі вясёлыя, радасныя, калі роўнымі радамі ішлі мы, не адстаючы ад дужэйшых за вас чырвонаармейцаў. Мне тады здава-

лася, што з такімі хлопцамі можна горы зрушыць! А другое— сёньня, калі некаторыя з вас не асьмельваюцца проста ў вочы глянуць. Я думаю, што і вы адчуваеце розьніцу паміж гэтымі двума днямі і пэўна дорага-б заплацілі, каб сёньняшняга дня ў вас ня было. Правільна?

Хлопцы моўчкі кіўнулі галавою.

Іваноў расказаў ім пра барацьбу, якая спрадвеку ішла за тое, каб народ меў права сам наладжваць сваё жыцьцё.

— Цяпер мы гэтае права заваявалі! Вы, маладыя будаўнікі, вы самі для сябе вучыцеся будаваць новае жыцьцё, не такое дрэннае, як ваш сёньняшні дзень, а больш падобнае на дзень у часе касьбы—ясны, сонечны, вясёлы, працоўны.

Хлопцы не варушыліся, апусьціўшы галовы. Іваноў сеў на вакно, а ў пакоі запанавала поўная ціша.

— Гошка, гэта да цябе,—увайшла потым ў пакой Стэпа і ўвяла нейкага чалавека.

Гошка зьдзіўлена паглядзеў на незнаёмага, які нерашуча спыніўся.

— Вам што?—запытаўся загадчык.

— Ды тут мой хлопец у вас знаходзіцца. Ягор Дзянісаў,— сказаў незнаёмы, аглядаючы хлопцаў.

— Гошка, ідзі, твой бацька...—штурхалі яго дзяўчаты, але Гошка ня йшоў: які-ж гэта бацька?—Бацька малады быў, а гэты зусім стары.

— Дзянісаў, што-ж гэта ты не падойдзеш да бацькі?— сказаў загадчык.

Хлопцы загаманілі, абступілі Гошкавага бацьку, пачалі разглядаць і распытваць яго.

— Не пазнаеш, відаць? Гошка, гэта я,—сказаў бацька.

Гошка падышоў і прывітаўся за руку.

— Не пазнаў... Ты пастарэў так... Я думаў, цябе і ў жывых няма.

Сход сам сабою спыніўся на радасьць дзяцей; рады былі і дарослыя.

— З прычыны такой радаснай падзеі, абвяшчаю сход скончаным,—сказаў загадчык і сам далучыўся да дзяцей.

У сталовай, за вялікім самаварам доўга ішла гутарка хлопцаў з Гошкавым бацькам.

На другі дзень Гошка сабраўся з бацькам у горад, а адтуль—у сваю вёску.

Увесь дзіцячы дом, як адзін, праводзіў іх да самае станцыі.

## XXV

## АПОШНЯЯ

Праз тры гады пасьля апісаных падзей з вагону цягніка, які толькі што прышоў на станцыю «Чарамошнікі» выйшаў малады хлопец з клункам за плячыма.

Аглядзеў станцыю, зірнуў па бакох, як-бы нечага шукаў.

— Гэтак-сама ўсё, па-старому,—сказаў ён сам сабе і пайшоў па рэйках да рэчкі.

— Відаць, не чакаюць; вось зьдзівяцца—усьміхаючыся, размаўляў ён сам з сабою.

Каля берагу некалькі рабочых нешта вымяралі ланцугамі; адзін зусім малады стаяў ля інструманту і запісваў у кніжачку.

Падышоў бліжэй—знаёмы твар.

— Што глядзіш, пазнаеш ці што?—запытаў малады, ідучы да рабочых.

— Міхалка, здаецца?—крыкнуў той, што прыехаў.

— А ты хто?—спыніўся той.

Хлопец засьмяяўся:—успомні!

— Тфу ты, Гошка! Вось ніколі-б не пазнаў! Ну, здароў, і вырас-жа ты!

І два таварышы, што часта ішлі адзін супроць аднаго з задавальненьнем пацiснулі рукі.

— Што тут робіш?—спытаўся Гошка.

— Зямлю мераю.

— Навошта?

— Як навошта? Дзялянкі разьбіваю.

— А дзе другія хлопцы?

— Якія? Я ўжо трэці год там ня жыву.

— Трэці год? А дзе-ж ты быў?

— Вучыўся. Загадчык Іван Мікалаевіч паслаў мяне на тэхнічныя курсы. Цяпер канчаю. Вось зараз на практыцы.

— Вось які ты—вучоны! А Міколка?

— Міколка ў рамесьніцкім...

— Ну, хто-ж яшчэ?—успамінаў Міхалка.—Зоська—у прафэсыянальнай, таксама, здаецца канчае цяпер. Іншыя там яшчэ. У іх цяпер вялікая гаспадарка: зямлю аруць, хлеб сеюць. Сымонка за галоўнага, да гаспадаркі здольны. Рыгор шавецкай загадвае, Андрэйка—кошыкавай майстэрняй.

— А Тайдан?

— Тайдан—па-старому за старшыню камітэту.

— Загадчык той самы?

— Так, стары, Іван Мікалаевіч.

— Ну, бывай,—сказаў Гошка.—Я да іх, захацелася пабачыць.

— Бывай. Скажы там: ад Міхалкі прывітаньне. Хай прыяжджаюць на лодцы, я яшчэ тут з тыдзень пабуду.

Ягор пайшоў лесам, абмінуў балота і выйшаў да Чырвонага Яру.

Направа зьзяла на сонцы рэчка, а налева на самым беразе, узьнімаўся падноўлены дом з новымі варотамі, якія зрабілі самі маладыя будаўнікі.

---

1964

# ЗЬМЕСТ

*Стар.*

| | | |
|---|---|---|
| I. | Жыцьцё-быцьцё | 3 |
| II. | На волі | 7 |
| III. | Чорны чалавек | 9 |
| IV. | У Тайдана | 13 |
| V. | Госьці | 15 |
| VI. | Трывожная ноч | 19 |
| VII. | Сьляды | 21 |
| VIII. | У лесе | 23 |
| IX. | Надзейнае месца | 26 |
| X. | Неспадзяванае здарэньне | 29 |
| XI. | Завіруха | 31 |
| XII. | Знаходка | 35 |
| XIII. | На другі дзень | 39 |
| XIV. | Чырвоныя падаюць веcткі | 42 |
| XV. | У чаканьні | 47 |
| XVI. | Новы загадчык | 50 |
| XVII. | Жыцьцё па новаму | 53 |
| XVIII. | Неспадзяваная бяда | 58 |
| XIX. | Нечаканае спатканьне | 64 |
| XX. | Забастоўшчыкі | 70 |
| XXI. | Няхай жыве Першае мая! | 72 |
| XXII. | Новая ўлада | 76 |
| XXIII. | Палітрук | 79 |
| XXIV. | Контррэволюцыя | 82 |
| XXV. | Апошняя | 86 |

B0000002600126